штотыднёвая
грамадска-асветніцкая
газета
KIMPRESS.BY

КУЛЬТУРА

21
мая
2022 г.
№21 (1564)

Куды перамесціцца апошні дзень Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур?

ст. 5

Якая яна, свацця з Лелікава, і чаму да яе такая ўвага?

ст. 12

Чыя творчасць стала сведкай партызанскіх подзвігаў і драм?

ст. 14

Што цярпліва чакае вырашэння свайго лёсу на падворку ў Студзёнцы?

ст. 15

“Магія” і слова “змагу”

Прэм’ера мюзікла “Магія” ў новым спартыўна-культурным цэнтры стала доўгачаканым праектам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Працяг на ст. 7

Сустрэчы дома і ў гасцях

17 мая адбылася чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства. Дзякуючы сродкам відэасувязі ўдзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Працягваецца падрыхтоўка да святкавання 140-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. У філіяле Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў Вязынцы праводзяцца работы па замене і рамонце стрэх на будынках і абсталявання артэзіянскай свідравіны. Серыя святочных мерапрыемстваў, прымеркаваных да юбілею класіка, распачнецца 26 чэрвеня і працягнецца наступныя два тыдні.

6—7 чэрвеня ў Маскве пройдуць Дні культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі, у рамках якіх адбудзецца сумесная калегія Міністэрстваў культуры. Таксама ў праграму Дзён культуры ўключаныя два спектаклі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, якія будуць дэманстравацца з рускімі субцітрамі. Акрамя таго, будзе прадстаўленая выстава сучаснага беларускага мастацтва і выстава, прысвечаная гісторыі тэатральнай культуры Беларусі, зладжаная Нацыянальным гістарычным музеем.

У рамках дзён кіно будуць прадстаўленыя сучасны беларускі кінематограф, анімацыя і дакументальныя фільмы. У праграме таксама паўдзелнічаюць ансамбль народнай песні і музыкі "Шчодрыца" Мінскага гарадскога палаца культуры і фальклорны ансамбль славянскай песні "Збіцень" Гомельскай абласной філармоніі. Акрамя таго, запланаваная сустрэча з прадстаўнікамі беларускай дыяспары.

Газета — рэгіёны — чытач

Аднаўленне ўнікальнага па прыгажосці Жыліцкага палаца ў Кіраўскім раёне распачата ў 2009 годзе. Ці не адразу пасля гэтага ў Жылічы пралеглі маршруты стыхійных турыстаў на роварах, легкавіках і бусіках. У пэўнай ступені на іх актыўнасць паўплывалі публікацыі "К". Што на сёння ўжо зроблена на замкавым комплексе і што мяркуецца зрабіць?

Уладзіслаў Кулакевіч, дырэктар Жыліцкага гістарычнага комплексу-музея

— Першая чарга аднаўленчых работ уключала рэканструкцыю заходняга палацавага крыла. Тут месціцца цяпер дзіцячая школа мастацтваў. Другі этап работ — узнаўленне паўднёвага флігеля, дзе знаходзіцца наш музей. За аранжарэю пакуль не браліся. Летась была падрыхтавана адпаведная дакументацыя. Сёлета прыйшлі грошы. Будзе ўзноўлена частка зімовага саду. На астатняй плошчы з'явяцца канферэнцзала і кавярня. Трэцяя чарга — давядзенне да ладу галоўнага корпуса. Мяркуецца, што работы будуць выкананы цягам года... Так, турыстаў вельмі шмат. Толькі школьнікаў Бабруйска пабывала ў нас за два апошнія месяцы больш за тысячу.

Па творчых акцыях Навагрудскай раённай бібліятэкі можна смела складаць энцыклапедыю адметных бібліятэчных праектаў. Паўтараў па Беларусі вы не знойдзеце. Апошняя ідэя, з поспехам пераўтвораная ў жыццё, — яшчэ адно пацвярджэнне сказанаму. У бліжэйшых нумарах "К" мы змесцім з гэтай нагоды вялікі аналітычны артыкул. А пакуль — анонс.

Фаіна Малюжэнец, метадыст Навагрудскай раённай бібліятэкі

— Сучасным бібліятэкарам трэба быць мабільнымі і гатовымі да нестандартных сітуацый і змен. Мы не здраджваем класічнаму разуменню бібліятэчнай сутнасці, але і чакаць з мора надвор'я не маем права. Мы гэтае надвор'е ствараем самі. Чарговы праект — бібліятэчнае экскурсійнае абслугоўванне турыстаў. Называецца ён "Рэтра-падарожжа з навагрудскай грамадзянкай". На міжнародным вясновым кірмашы турыстычных паслуг "Адпачынак — 2022" праект карыстаўся павышаным попытам, што не магло не адбіцца на колькасці экскурсантаў.

20 мая народны ансамбль беларускай музыкі і песні "Прыняманцы" адзначыў саракагоддзе з моманту стварэння. Калектыў складаецца з выкладчыкаў Бярозаўскай дзіцячай школы мастацтваў. Канцэртная праграма да юбілею была цалкам аўтарскай. Але не менш таленавітыя ва ўстанове і выхаванцы.

Анжэла Сабалеўская, намеснік дырэктара Бярозаўскай ДШМ па навучальна-выхаваўчай рабоце

— Удзел у фестывалях — ці не галоўны паказчык творчай актыўнасці нашых школьнікаў. Ужо сёлета ў міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і раённых конкурсах прынялі ўдзел 50 юных талентаў. За 2021 год такіх удзельнікаў было амаль сто. У большасці, натуральна, гэта анлайн-фестывалі. Але не ігнаравалі і вочны ўдзел, бо артыст павінен адчуваць залу і бачыць сваіх слухачоў. 7 мая, да прыкладу, ездзілі ў Ліду на рэгіянальны фестываль дзіцячай творчасці "Ільвяня". Тады выступалі баяністы і акардэаністы. А сёння, 21 мая, выступяць скрыпачы.

Падрыхтаваў Яўген РАГІН

"Класіка ля Ратушы" — культурны брэнд Мінска

Час праменаду

Сёння ў сталіцы адкрыецца летні музычна-турыстычны сезон. Ля сцен гарадской ратушы і ў іншых кутках гістарычнага цэнтра штосуботу публіку чакаюць канцэрты, кінапаказы, тэатральныя пастаноўкі і майстар-класы.

Імпрэзы сёлета прысвечаны 955-годдзю першай летапіснай згадкі Мінска і Году гістарычнай памяці. Як паведаміў начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віталь Брэль, у праграме будуць адлюстраваны розныя старонкі мінуўшчыны горада, яркія набыткі музычнага, харэаграфічнага і тэатральнага мастацтва.

Традыцыйна сезон пачнецца праектам "Дзеці сталіцы". У яго рамках на галоўнай пляцоўцы выступяць навучэнцы дзіцячых музычных школ мастацтваў. Яны прадэманструюць майстэрства ў розных кірунках — інструментальнае выканальніцтва, вакал, харэаграфія. Таксама ў канцэрце-адкрыцці паўдзельнічае аркестр Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.І. Глінкі. Некалькі кампазіцый разам з калектывам выканае выпускнік гэтай навучальнай установы, народны артыст Беларусі Эдуард Ханок.

У дворыку гатэля "Манастырскі" ўпершыню будзе працаваць імправізаваная тэатральная зала пад адкрытым небам. Сёння ўдзень там выступяць выхаванцы тэатральнага аддзялення дзіцячай школы мастацтваў №2, а ўвечары запланавана пастаноўка навучэнцаў гімназіі №50 "А золкі тут цісія..." Юныя артысты самастойна падрыхтавалі інсцэніроўку аповесці Барыса Васільева і пераклалі яе на беларускую мову.

У наступную суботу ў Верхнім горадзе пройдуць Рэспубліканскі фестываль-кірмаш народных мастацкіх рамёстваў "Вясновы букет" і акцыя "Харавыя сустрэчы ля ратушы". Таксама летнюю афішу ўпрыгожаць вечары джаза, канцэрт акадэмічнага ансамбля танца "Харошкі" і музычныя сустрэчы "Класіка ля ратушы". Аматараў кіно запрашаюць на прагляды папулярных айчынных фільмаў пад адкрытым небам. Завершыцца сезон 17 верасня.

Апытанне месяца!

Калі б я быў(-ла) галоўным рэдактарам газеты "Культура", то... (дапішыце)

Нашы чытачы могуць пад сваім імем або ананімна даслаць у рэдакцыю прапановы, якія б яны перш-наперш ажыццявілі, калі б былі галоўным рэдактарам газеты "Культура".
Самыя цікавыя і канструктыўныя з іх будуць надрукаваныя ў газеце і на сайце.
Адрас электроннай пошты:
kultura.bel@yandex.by
або звяртайцеся па тэлефонах
+375 29 294 72 43,
8 017 203 75 74.
Чакаем вашы прапановы!

Фотафакт

Віцебск актыўна рыхтуецца да Міжнароднага форуму мастацтваў "Славянскі базар...". 19 мая ў дырэкцыі фестывалю адбылася рабочая нарада з удзелам начальніка ўпраўлення дзяржаўных культурных мерапрыемстваў Міністэрства культуры краіны Іны Адамовіч і рэжысёрска-пастаноўчай групы.

Міністр культуры Беларусі Анатолій Маркевіч (справа) на сустрэчы з Іванай Жыган у Акадэміі музыкі

Славянская душа спявае

Да Дня славянскага пісьменства і культуры, які адзначаецца 24 мая, ва ўстановах вышэйшай адукацыі сферы культуры адбылася серыя канцэртаў "Пакуль Зямля яшчэ круціцца..."

Гэта міжнародны творчы праект сербскай актрысы і рэжысёра Іваны Жыган і расійскага акцёра Аляксандра Цуркана.

Аўтары паставілі мэту на зразумелай моладзі мове расказаць пра агульныя каштоўнасці славянскіх народаў. Дзеля гэтага напоўнілі праграму песнямі і вершамі беларускіх, рускіх і сербскіх аўтараў пра любоў да сваёй зямлі і ўсяго свету, важнасць міру. Разам з вядомымі артыстамі выступілі студэнты нашых творчых ВНУ.

— Гэта своеасаблівая ода любові не толькі паміж беларускім, рускім і сербскім народамі, але і любові да ўсіх людзей на Зямлі. Канцэрт перадае бераўлівае стаўленне да планеты, якая сёння знаходзіцца пад пагрозай, — тлумачыць ідэю праграмы Івана Жыган.

Дарэчы, гэта не першы візіт сербскай артысткі ў нашу краіну і не першы сумесны праект з беларускімі творцамі. На мяжы тысячагоддзяў Івана Жыган зняла тэлефільм "Зямля пад белымі крыламі", а ў 2015-м да 70-й гадавіны Перамогі на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра прэзентавала спектакль "Белыя жураўлі". У гістарычным мюзікле пастаноўшчыца прапанавала смелае прачытанне тэмы вайны праз спалучэнне оперы, хіп-хопа, балета і народных танцаў. І сёлета Івана Жыган працуе над сумесным беларуска-сербскім праектам — спектаклем "Ідыёт" паводле рамана Фёдара Дастаеўскага ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Максіма Горкага.

Музейнае бяссонне

Да міжнароднай акцыі "Ноч музеяў" далучаюцца беларускія ўстановы. Сёння яны падоўжаць час працы, некаторыя амаль да світання. Штогод вызначаецца агульная тэма свята (сёлета – "Сіла музеяў"), але кожная пляцоўка ўзбагачае фармат сваімі цікавінкамі.

Самай доўгай ноч будзе ў сталічным **Палацы мастацтва**. Там наведвальнікаў чакаюць да 3-й гадзіны. Акцыя пад слоганам "Пакуль ніхто не бачыць" аб'яднае экскурсію па выставе "Партрэт часу", лекцыі, перформанс пераможцы "Восеньскага салону — 2020" Яўгена Шчэрбача, музычныя імправізацыі і танцавальны батл.

Свята ў **Нацыянальным мастацкім музеі** пачнецца з адкрыцця выставы "Уладзімір Садзін. Мастацтва падарожнічаць", якая ўключае больш за 50 графічных работы, сувеніры, кнігі і асабістыя рэчы творцы. Таксама наведвальнікаў чакаюць майстар-клас па саломапляценні, лекцыі па індыйскай культуры і канцэрт "Ад класікі да джаза". А **Нацыянальны гістарычны музей** дапаможа познім гасцям разабрацца, як склаці радавод. На прыкладах экспазіцыі "Беларусь у партрэтах і геральдыцы" ўдзельнікі засвояць галоўныя правілы працы над генеалагічнымі табліцамі і створаць эскіз сямейнага дрэва для свайго роду.

Сакрэты тэатральнай грымёркі абяцаюць раскрыць у **Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры**. Там пройдзе інтэрактыўны занятак, прысвечаны асноўным прыёмам работы грымёра, і майстар-клас па візажы. Акампанемантам да начной прагулкі па залах стане канцэрт студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

У **Літаратурным музеі Максіма Багдановіча** гэтая ноч пройдзе "На высокай ноце". Праграма пад такой назвай пачнецца выступленнем ансамбля салістаў "Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам Людмілы Калініўскай. У выкананні лаўрэатаў міжнародных конкурсаў прагучаць творы Генрыха Вяньяўскага, Пабла Сарасатэ, Каміля Сен-Санса і Марыса Равеля. Далей этнограф Алесь Лось зладзіць канцэрт-лекцыю пра паходжанне музычных інструментаў, а гурт "Кудмень" выканае традыцыйныя песні Палесся. Апоўначы пачнецца паказ анімацыйных стужак нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" — ад жыццяпісаў вядомых суайчыннікаў да псіхадэлікі часоў перабудовы.

Праграма ў **Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы** будзе прысвечана адразу двум юбілеям — 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і 955-годдзю першага ўпамінання Мінска. На адну ноч залы ўстановы ператворацца ў вуліцы старога горада. На Траецкім кірмашы госці сустрэнуцца з гераіняй Купалавага верша "Бабулька — прадаўчыца зёлак" і дазнаюцца ад яе сакрэты лекавых траў. Таксама наведвальнікі змогуць адчуць сябе ўдзельнікамі акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі 1926 года, у якой удзельнічаў Янка Купала, і, вядома, завітаць на новую выставу "Янка Купала і Якуб Колас. Досціпы ад класікаў". А каб свята надоўга захавалася ў памяці, можна зрабіць здымак у адмысловай фотазоне.

У рамантычную вандроўку ў мінуўшыну сталіцы таксама запрашаюць **Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага** і **Мінская гарадская ратуша**. Там наведвальнікам давядзецца разабрацца ў справе пра фальшывыя манеты і падробленыя дакументы. На шляху да ісціны ўдзельнікі сустрэнуць сакратара дваранскага дэпутацкага сходу Юрыя Кабылінскага, майстра кавальскай справы і іншых цікавых асоб. А затым у ратушнай зале пад купалам адбудзецца рэтра-праграма з аповедам пра гісторыю кінематографа і праглядам нямых фільмаў.

Насычанай Ноч музеяў будзе і ў рэгіёнах. Жыхароў і гасцей Віцебска запрашае **арт-прастора "Талстога, 7"**. Ва ўстанове будзе працаваць фоталабараторыя пад кіраўніцтвам Юрыя Раброва і калажная майстэрня мастачкі Ганны Карасёвай. Таксама наведвальнікі змогуць трапіць на цыркавы перформанс расійскага артыста Мікалая Чалнакова і аўтарскую экскурсію дырэктара Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва Андрэя Духоўнікава.

Гамяльчанам жа падораць магчымасць убачыць крохкія артэфакты, якія звычайна недаступныя шырокаму колу. У калоннай зале **палаца Румянцавых і Паскевічаў** усяго на некалькі гадзін выставяць рукапіс "Гора ад розуму" Аляксандра Грыбаедава, мініяцюрныя партрэты князёў Паскевічаў, Евангелле, надрукаванае Пятром Мсціслаўцам, і іншыя каштоўнасці.

Даніл ШЭЙКА

Вячэрняя экскурсія па экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея

Гэта мая газета

Вікторыя Бусел, дырэктар Светлагорскай раённай бібліятэчнай сеткі:

— Ужо больш за дзесяць гадоў чытачы Светлагорска і Светлагорскага раёна разам з супрацоўнікамі бібліятэк маюць магчымасць штотыднёва знаёміцца з матэрыяламі газеты "Культура". Рознабаковасць і шматграннасць рубрык дае магчымасць кожнаму знайсці свае цікавасці ды інтарэсы на папяровых старонках выдання. Менавіта мяне заўсёды вабяць бібліятэчныя практыкі калег з розных рэгіёнаў нашай і не толькі нашай краіны, мэтанакіравана сабраныя пад тэматычным загалоўкам, што мае асаблівую інфармацыйна-пазнавальную каштоўнасць — ёмістa і змястоўна раскрываецца пытанне, і часам дзякуючы гэтаму атрымліваеш напрамак ідэі для стварэння новага праекта.

Часам у працы мы сутыкаемся з необходнасцю атрымання кампетэнтных "культурных" каментарыяў да заканадаўчых актаў, прававых падказак і інш. — было б добра мець такую магчымасць праз вашу газету.

Лілія Арцюх, дырэктар Карэліцкай раённай бібліятэкі:

— З газетай "Культура" я знаёмая з 1994 года, калі прыехала працаваць бібліятэкарам у чытальную залу Карэліцкай раённай бібліятэкі. Вось з таго часу з ёй не развітваюся, выпісваю яе асабіста. Яна размяшчае самыя свежыя навіны з дзейнасці сферы культуры і мастацтва, таксама матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклору.

Як бібліятэчнаму работніку, мне цікавыя артыкулы пра сучасную дзейнасць бібліятэк, матэрыялы па краязнаўстве, інтэрв'ю з вядомымі людзьмі галіны культуры. Абавязкова звяртаю ўвагу на рубрыку "Адказы з міністэрства" і "Газета — рэгіёны — чытач". Часта дасылаем свае матэрыялы пра мерапрыемствы, якія праходзяць у бібліятэках раёна, але, на жаль, не заўсёды яны друкуюцца.

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

Таямніцы беларускай бульбы

Ці мае права дранік называцца нацыянальным прадуктам?

Як мы паведамлялі, на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры, што адбылося 13 мая, была разгледжаная прапанова аб наданні статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці элементу "Страва з таркаванай бульбы (бульбяныя бліны, бабкі, дранікі і іншыя) — традыцыі прыгатавання і спажывання".

Ініцыятар намінацыі, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Тадэвуш Навагродскі выказаў меркаванне, што ўключэнне згаданага элемента ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей садзейнічае фарміраванню і развіццю ідэнтычнасці беларускага этнасу, і яго можна лічыць сапраўды знакавай падзеяй.

Даследчык адзначыў, што пра адметную ролю бульбы ў жыцці беларусаў сведчыць нават экзаэтнонім "бульбашы", які з'явіўся ў дачыненні да беларусаў у нядаўнім мінулым. Часам яго ўспрымаюць як абразлівы, але, на думку дакладчыка, сам факт прыхільнасці беларусаў да страў, прыгатаваных з бульбы, не нясе ў сабе нічога крыўднага. Іншая справа, што для яго адэкватнага ўспрымання варта праводзіць работу па папулярызацыі адпаведных кулінарных пераваг і традыцый.

КАРАНІ ПЫТАННЯ

Бульба з'явілася на тэрыторыі Беларусі адносна позна, і першыя згадкі пра яе ўжыванне на нашых тэрыторыях адносяцца да сярэдзіны XVIII стагоддзя, у часы панавання караля Рэчы Паспалітай Аўгуста III. Тады традыцыі спажывання толькі пачалі фарміравацца, і спачатку нашыя продкі нават не адразу ўсведамлялі, якую частку расліны можна есці, спрабавалі ўжываць у ежу ягады, якія ўзнікаюць на бульбе пасля квітнення, а іх кепскі смак і непрыдатнасць для харчавання выклікалі сярод сялян незадаволенасць і нават бунты.

Працэс прыняцця бульбы ішоў марудна, і нават у сярэдзіне XIX стагоддзя ў структуры пасяўных плошчаў яна займала толькі 2,5%, але з другой паловы стагоддзя выкарыстанне яе ў ежу значна пашырылася. У гэты час даследчыкі, якія вывучалі сельскую гаспадарку Беларусі, адзначалі, што бульба зрабілася для мясцовых сялян своеасаблівым замяняльнікам жыта. Але гэтаму папярэдничала засвойванне бульбы і спосабаў яе спажывання сярод мясцовай шляхты. Рэцэпты існавалі самыя дзівосныя — як сведчаць архіўныя дакументы, бульбу часам фаршыравалі анчоўсамі і селядцом.

Зрэшты, сярод шырокіх мас сялянства больш прыжылося спажываць бульбу з салам і скваркамі. Святочна-абрадавага значэння стравы з бульбы не набылі, бо даволі позна з'явіліся на стале ў беларусаў, калі кулінарныя пераваг нашых продкаў ужо сфарміраваліся. Як паказваюць сведчанні, атрыманыя падчас этнаграфічных экспедыцый, нават у міжваенныя гады бульба лічылася не надта прэстыжным прадуктам. Відавочна, што спачатку беларусы гатавалі стравы з цэлай бульбы, і толькі потым перайшлі да здробленай, у тым ліку і таркаванай. Але важныя традыцыі не толькі прыгатавання, але і ўжывання, у тым ліку посуд, які выкарыстоўваецца, спосаб падачы на стол, нормы этыкету, якія пры гэтым выконваюцца.

ДЗВЕ СОТНІ РЭЦЭПТАЎ

Вядучы спецыяліст Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алена Калінoўская распавяла, што пры падачы заяўкі на наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці былі ўлічаныя каля паўтысячы носьбітаў традыцый прыгатавання страў з таркаванай бульбы. Вядома, у гэты лік увайшлі тыя, хто не проста гатуе такія стравы, але гатовы дзяліцца рэцэптамі ды іншай інфармацыяй, папулярызаваць гэтую традыцыю.

Найбольш папулярнымі са страў, што гатуюцца з таркаванай бульбы, можна лічыць дранікі. Падчас падрыхтоўкі намінацыі на наданне статусу нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці было прааналізавана больш за дзве сотні рэцэптаў дранікаў з усёй краіны, але арыгінальнымі можна назваць бадай што палову з іх. Тут маюцца самыя розныя варыяцыі: з выкарыстаннем насення і гародніны і, вядома ж, з самымі рознымі начынкамі, пераважна мясными. Таксама браліся пад увагу розныя дадаткі да стравы, такія як скваркі, смятана і грыбныя поліўкі. У розных мясцовасцях Беларусі ўжываюцца адметныя назвы дранікаў, агульная колькасць якіх дасягае некалькіх дзясяткаў.

Калі дранікаў заставалася багата і яны не былі з'едзеныя адразу пасля прыгатавання, іх прынята было тушыць у гаршку. Акрамя знакамітых бульбяных аладак, гатавалі з таркаванай бульбы бабку, кішку ды бульбяныя бліны. Падчас пасяджэння рады выступіла таксама адна з носьбітак традыцыі гатавання страў з бульбы, загадчык філіяла "Дом культуры аграгарадка Юбілейны" Марыя Бачынская, якая распавяла аб традыцыі гатавання традыцыйнай стравы з бульбы, вядомай пад мясцовай назвай "банды" (з націскам на апошні склад), што гатуецца ў печы на дубовым лісці. У банды дадавалі мяса, падчарэвак, часнык, перац, каляндру і цыбулю.

ЖАРСЦІ ВАКОЛ ДРАНІКА

Цікава, што наданне традыцыям гатавання і спажывання страў з таркаванай бульбы статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці выклікала ў сеціве бурлівую дыскусію як у колах адмыслоўцаў, так і сярод шараговых грамадзян. Са спрэчак з гэтай нагоды вынікае, што ў грамадстве пакуль яшчэ часам бракуе яснага ўсведамлення, што з сябе ўяўляе нематэрыяльная спадчына ды якія з'явы і на якіх падставах могуць прэтэндаваць на ўключэнне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Эксперт ад Беларусі ў Міжурадавым камітэце па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO Ала Сташкевіч падкрэслівае, што прадстаўленая намінацыя, якая ахоплівае ўсе рэгіёны Беларусі, аддлюстроўвае менавіта каштоўнасныя характарыстыкі элемента спадчыны — тое, што называецца "прадметам аховы": лакальныя асаблівасці рэцэптуры страў, традыцыі ўжывання, іх адлюстраванне ў фальклоры.

Для папулярызацыі традыцый гатавання і спажывання страў з таркаванай бульбы сёння ладзяцца дзясяткі гастранамічных фестываляў, свят і кірмашоў. Бульбяныя прысмакі і звязаныя з імі традыцыі даўно зрабіліся своеасаблівым нацыянальным брэндам, і застаецца спадзявацца, што рашэнне аб наданні ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці дазве толькі спрыяць іх захаванню ды пашырэнню сярод беларусаў.

Антон РУДАК

Фота з прэзентацыі, прадстаўленай на пасяджэнні

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

Ад кінадворыкаў да Аўгустоўскага канала

Гродзенская брукаванка ў чаканні святочных маршаў

У пачатку чэрвеня Гродна прыме заключныя імпрэзы Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Трынаццаты раз у абласным цэнтры збярэцца прадстаўнікі розных этнічных супольнасцей, якія пражываюць у нашай краіне.

Фестываль нацыянальных культур — сяброўскіх сустрэч

Беларусь стала агульным домам для людзей розных нацыянальнасцей і веравызнанняў, і фэст у Гродне штораз пацвярджае каштоўнасць міжкультурнага дыялогу, служыць прыкладам яднання праз творчасць. За святам па праве замацаваўся статус гарадскога і рэспубліканскага брэнду са сваімі традыцыямі. На ўпрыгожаных шматлюдных вуліцах гучаць мелодыі розных краін, паспытаць стравы нацыянальных кухань і пазнаёміцца з шэдэўрамі народных майстроў запрашаюць тэматычныя падворкі. А ўверцюрай да фестывалю традыцыйна служыць тэатралізаванае шэсце ўдзельнікаў.

Абноўлены лагатып фестывалю

Сёлета па задумцы рэжысёраў кожная дыяспара пранясе перад публікай вялікія стылізаваныя кветкі — сімвалы сваіх краін. Малдаване ўпрыгожаць калону ружамі, беларусы — валошкамі, рускія — рамонкамі. І, вядома, кожная суполка пакажа яркія фрагменты традыцыйных танцаў. Пасля гэтага пачнецца ўрачыстая цырымонія адкрыцця, сцэнарый якой пабудаваны вакол вобразу агню — сімвала хатняга ачага, творчага ўздыму і сардэчнасці. Падрабязнасці відовішча арганізатары пакуль не раскрываюць, каб свята сталася сапраўдным сюрпрызам для гледачоў.

Акрамя традыцыйных імпрэз, фэст штораз уражвае навінкамі. Асаблівасці сёлетняга свята днямі абмеркавалі на пасяджэнні аргкамітэта на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Ігарам Петрышэнкам. Адным з новаўвядзенняў будзе круглы стол "Беларусь — наш агульны дом: адзінства нацый і пакаленняў", які арганізуе Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Для абмену думкамі падзея збярэ ў гродзенскай галерэі Тызенгаўза кіраўнікоў 21 нацыянальнага аб'яднання — членаў Кансультатыўнай Міжэтнічнай Рады пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей — і іншых зацікаўленых асоб. З прадстаўнікамі некаторых народаў Беларусаў яднаюць і трагічныя старонкі мінуўшчыны, таму пад знакам Года гістарычнай памяці запланаваны мітынг ля Кургана Славы, прэзентацыя кнігі "Сёстры Хатыні", тэматычныя круглыя сталы.

Як расказала дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Вольга Антоненка, яшчэ адной навінкай свята стане фестываль прыгажосці і грацыі. "Непрыгожых дзяўчат не быве", — з такой думкай арганізатары адмовіліся ад фармату спаборніцтва і вырашылі зладзіць менавіта сяброўскую сустрэчу, дзе прадстаўніцы розных нацыянальнасцей выступяць з творчымі нумарамі і пакажуць традыцыйныя строі сваіх краін.

Таксама ўпершыню на фестывалі запрацуюць кінадворыкі. У імправізаваных кінатэатрах пад адкрытым небам у розных пунктах горада пакажуць карціны нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", а таксама стужкі краін, адкуль паходзяць удзельнікі свята. Безумоўна, не застануцца госці Гродна без беларускіх пачастункаў, без знаёмства з нашымі народнымі ўмельцамі: усю шматграннасць культуры прадэманструюць удзельнікі з розных рэгіёнаў на пляцоўцы "Беларускі падворак", якая разгорнецца на плошчы Леніна.

Чакаюць на фестывалі таксама беларусаў замежжа. З Санкт-Пецярбурга на свята прыедзе вакальны ансамбль "Рэтра-хіт", рэпертуар якога налічвае больш за паўтысячы песень — пераважна беларускіх. Нязменны кіраўнік калектыву Віктар Каваленка, ураджэнец Рэчыцы, з асаблівай цеплынёй ставіцца да творчай спадчыны Уладзіміра Мулявіна, штогод ладзіць вечарыны памяці народнага артыста. Менавіта песняроўскімі хітамі ансамбль плануе ўразіць публіку на адкрыцці фестывалю і сольным канцэрце.

Збіраецца завітаць у Гродна ансамбль беларускай народнай песні "Надзея" беларускага таварыства "Прамень" з Рыгі. Гэты калектыў вырас са спеўнага гуртка, які ўзнік напрыканцы 1980-х гадоў. Пачаўся творчы шлях з песні "Люблю мой край" на словы Канстанцыі Буйло, што вельмі сімвалічна: калектыў яднае людзей рознага ўзросту і прафесій, якія імкнуцца зберагчы духоўную сувязь з радзімай.

ПАДАРУНАК ДА ФЭСТУ

На першы дзень фестывалю запланавана ўрачыстае адкрыццё новага будынка — адноўленага "Дома рыбака" на вуліцы Замкавай, які быў разбураны ў пасляваенныя гады. Паводле ўмоў аўкцыёну, новы гаспадар зямельнага ўчастка мусіў узвесці там гандлёва-офісны цэнтр, аднак пасля вывучэння гісторыі месца інвестар змяніў канцэпцыю і вырашыў адмавіць ранейшае абліччa гэтай часткі горада. Выгляд новага будынка максімальна набліжаны да аўтэнтычнага. Праз перагляд праекта бізнесмен нават згубіў каштоўныя квадратныя метры і такім чынам ахвяраваў камерцыйнай рыбавабнасцю аб'екта на карысць спадчыны. У будынку размесцяцца ўстановы грамадскага харчавання, крамы і офісы.

ЗАГАРАДНЫ ПАСТСКРЫПТУМ

Сёлета свята прадоўжыцца тры дні, і ў апошні перамесцяцца на Аўгустоўскі канал, дзе ў гэты час плануюць адкрыць турыстычны сезон. Як патлумачыла начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама Таццяна Кузьма, упершыню гэтая пляцоўка прыняла імпрэзы фестывалю ў 2018 годзе. Тады арганізатары атрымалі шмат станоўчых водгукаў, таму вырашылі паўтарыць вопыт і такім чынам закласці новую фестывальную традыцыю.

Праграму адкрые касціміраванае тэатралізаванае шэсце, пасля якога на галоўнай сцэне пачнецца сапраўдны творчы марафон: выступленні калектываў аматарскай творчасці Гродзеншчыны, рэгіянальны адкрыты фестываль "Танцевальная круговерть", канцэрт народнага ансамбля танца "Крыжачок" Белдзяржуніверсітэта і флэшмоб "Нас яднае Аўгустоўскі канал". Увечары на цэнтральнай пляцоўцы гасцям прапануюць дыска-шоу-праграму.

Упершыню на Аўгустоўскім канале адбудзецца "Шоу асілкаў", на якім выступяць аматары сілавога экстрыму. Напрыклад, чэмпіён свету і Еўропы па паўэрліфтынгу Аляксандр Кодзіс працягне тры загружаныя аўтамабілі, агульная вага якіх перавышае 30 тон. Яркае відовішча абяцаюць і ўдзельнікі "Бітвы лесарубаў". Па гастранамічным ўражанні варта завітаць на фестываль "Гасцінец". На яго пляцоўках прадстаўнікі розных куткоў Гродзеншчыны прэзентуюць адметныя стравы мясцовых кухань. Так кулінары з аграгарадка Адэльск парадуюць гасцей славутымі капытцамі, клінковым сырам, кішкай бульбяной і іншымі прысмакамі, якія маюць статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі.

Дзецям і падлеткам прыйдуцца даспадобы не толькі ласункі, але і старадаўнія забавы кшталту забегаў з каромыслам, кідання валёнкаў ці бою мяхамі. Вядома, падчас свята наведвальнікі змогуць наведаць музей гісторыі Аўгустоўскага канала, зладзіць велапрагулку або адпачыць на цеплаходзе.

Даніл ШЭЙКА

Адна з лакацый свята — Аўгустоўскі канал

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

Венеру не фатаграфаваць?

“Арт-Мінск 2022”: расці пакуль ёсць куды...

Кажуць, навукоўцы могуць па асобных фрагментах костак дагістарычнай істоты аднавіць яе вонкавы выгляд і нават целаскład. Аднак у такіх дапушчэннях заўсёды ёсць вялікая рызыка — скажам, пераблытаць дзюбу і кіпцюр, і ў выніку замест дыназаўра атрымаць птэрадактыля. Па ідэі, штогадовы фестываль “Арт-Мінск” павінен натхняць на абагульняльныя высновы адносна актуальнага стану беларускага мастацкага працэсу. Раней са мною, прызнацца, так і здаралася. Але гэтым разам я не буду прыпадабняцца згаданым вышэй навукоўцам і замест гіпатэтычнай рэканструкцыі пакіну фрагментарны россып сваіх уражанняў адносна ўбачанага.

Мікіта Вайлупаў. The людзі. 2022

Змена генерацый. Яна выразна адчувалася ўжо на мінулым “Восеньскім салоне”, склад удзельнікаў якога істотна абнавіўся. Гэтым разам прастору Палаца мастацтва таксама ў значнай меры запоўнілі новыя аўтары. Але столькі прыемных адкрыццяў, як на “Салоне”, са мною не здарылася. Канешне, сёе-тое вока адзначыла — скажам, фатаграфічны мінімалізм Семянкова або пераўтвораныя ў манекены постаці Таццяны Перыкавец.

Аднак, па шчырасці, мае агульныя ўражанні ад сёлетняга “Арт-Мінска” куды горшыя, чым ад усіх папярэдніх. Спадзяюся, што самое суседства з мэтрамі стане для неафітаў карысным. І яны — гэтаксама, як я — задумаюцца: у чым жа, уласна кажучы, соль? У чым прыкмета майстэрства?

Дакладна яна не ў тэхніцы і не ў стылістыцы. Як сведчыць выстава, эстэтычная падзелу паміж пакаленнямі няма. Бо сёння амаль усе аўтары існуюць у адной і той самай парадыгме — з пэўнай доляй умоўнасці яе можна акрэсліць як мадэрнісцкую. Што, на маю думку, вельмі добра: менавіта яна дае самы шырокі дыяпазон для выяўлення сваёй індывідуальнасці.

Прасоўваючыся па вялізнай зале, я часцей спыняўся менавіта ля твораў мэтраў (не чытаючы яшчэ этыкетак). Нешта было для мяне прыцягальнае ў той зіме, якую ўвасобіў Уладзімір Канцадайлаў. Здавалася б, чарговая абстракцыя, якіх на выставе шмат. Аднак абстракцыя ад абстракцыі розніцца.

Так, экспазіцыю трымаюць менавіта мэтры. Калі вы любіце, напрыклад, Сяргея Рымашэўскага (а яго, без сумневу, любяць многія), гэтую выставу дакладна варта наведаць. Мастак парадуе вас новым россыпам сваіх шчымлівых дзіцячых вобразаў родам з нейкай сумнай казкі.

Аднак будзем спадзявацца, што для кагосьці ўдзел у знакавым фэсце стане добрым авансам. Тыя мастакі, якія сёлета здзейснілі сваю даўнюю мару дэбютаваць на “Арт-Мінску”, але раней гэта не атрымлівалася, бо іх (прычым заслужана) адсоўвалі ў другі эшалон мэтры, зараз атрымаюць матывацыю рухацца далей.

Хіты. Трапляючы ў такую “вавілонскую куламесу”, мастак павінен імкнуцца нечым вылучыцца сярод усіх іншых. Зусім неабавязкова, каб гэта была “папса” або правакацыя: выразная ідэя альбо вобраз працуюць нават больш эфектыўна. Таму стаўка на выставачныя хіты цалкам вытлумачальная. Аднак чамусьці ўжо не першы год на “Арт-Мінску” іх не так і багата.

Адзін з яўных хітоў — “Зграя” Андрэя Пяткевіча. Ваўчыныя насы, якія высоўваюцца са шпакоўняў, — небанальны і ўражальны вобраз, адкрыты для самых розных трактовак. “Лютае небыццё” Марыі Тарлецкай, размешчанае на “авансцэне”, бярэ яркасцю колераў і немалым памерам. Мастачка, якая прызвычаілася працаваць з металам, гэтым разамахвяравала рукатворнай выкшталцонасцю дзеля, бадай, манументальнага ўвасаблення ідэі. Якой? Ну, гэта ўжо хай вырашаюць гледачы.

Абавязкова прыцягне ўвагу і “Новая Венера” Дзмітрыя Васільева — рэдкі па цяперашніх часах узор шматфігурнай карціны. Сярод антычных статуй у музеі — сучасная эмансіпаваная кабета ў мініі-спадніцы, статую якой чамусьці вандалізуе сваёй кавенькай іншая жанчына, апранутая куды больш строга. Што гэта — змаганне за добры густ альбо банальная зайздрасць да недасяжнага ідэалу прыгажосці? Гледачам, якія ходзяць у Палацэлымі кампаніямі, будзе пра што пагаманіць.

Камерцыя. Літаральна перад уваходам у глядзельную залу яркай плямай красуе твор Марыі Копець. Неонавыя літары сучасныя мастакі звычайна выкарыстоўваюць для важных выказванняў, але тут пасыл наіўна-мілы: “Need Money For Art”, для мастацтва патрэбныя грошы. Падаецца, пад такой мальбой, скіраванай у нябёсы (менавіта імі стараюць фон для надпісу), падпісаліся б ці не ўсе ўдзельнікі “Арт-Мінска” — хаця многія гэта старанна хаваюць.

Урэшце сам праект мае і чыста камерцыйны складнік: любы выстаўлены твор там можна купіць. Як і звычайна, большасць удзельнікаў аддалі перавагу самавыяўленню, на продажы не асабліва спадзяючыся. Аднак ёсць і тыя, хто выкарыстоўвае ўдзел у выставе са здаровай прагматычнай мэтай. Ніякіх крыўдаў і кпінаў: гэта іх прафесія.

Што ж такое камерцыйны жывапіс сёння? Як заўсёды, у асартыменце прадстаўлены тыповы набор запатрабаваных пакупнікоў жанравых твораў. Разнастайныя бярозкі, кветачкі і венецыянскія краявіды — гэта тэмы неўміручыя і непатапляльныя. Хоць нейкая канстанта ў цяперашнім плыткім свеце мастацтва!

Ёсць прапановы і для тых пакупнікоў, якія цэняць арыгінальныя ідэі ды маюць пачуццё гумару. Не сумняюся, што немалы па сваіх памерах (ды і па кошце таксама) трыпціх Алеся Багданава рана ці позна зойме пачэснае месца ў чыімсьці офісе або гасцёўні. Два па-майстэрску выяўленыя казлы ў дзелавых касцюмах паглядаюць на адну кветачку, размешчаную паміж імі. Пра іх думкі можна лёгка здагадвацца.

Дарэчы, партрэт гэтай аброслай рознымі канатацыямі жывёліны чамусьці намалявала і Алеся Скарабагатая — са звычайнай для сябе “мілатой”. Але куды лепей ёй удалася мышка, якая прытаілася сярод смачных багетаў і сыроў. Такую карціну ў офіс дакладна ніхто не павесіць, інакш супрацоўнікі ўвесь дзень будуць думаць толькі пра абед. А вось для сталовай — неблагі варыянт. Праўда, кошт — як кватэра ў райцэнтры. Але кагосьці і ён не спалохае.

...Карацей, у нішы камерцыйнага мастацтва ў нас пакуль што без перамен. Думаю, гэта заканамерна. Пагатоў, ні катэгорыя асноўных пакупнікоў, ні іх густы — даволі кансерватыўныя — істотна не мяняюцца.

Інтэрактыў. Гледачы ў Палацы мастацтва ёсць — значыць, з імі можна ўзаемадзейнічаць усімі даступнымі сёння сродкамі, у тым ліку і віртуальнымі. І не дзіва, што там з'яўляецца ўсё болей твораў, якія можна, фігуральна кажучы, кратаць рукамі. Праўда, часам запраграмаваны аўтарам характар узаемадзеянняў даволі банальны: прысядзьце, уявіце, нешта памацайце — і вам, магчыма, стане лепей...

Цудоўным узорам куды больш артыкуляванага і прадметнага дыялогу з гледачом з'яўляецца мастацкая практыка Надзеі Хмыль. Прапануючы рэцыпіенту нейкія простыя дзеянні — скажам, перакласці каменьчык з адной чашы шаляў на іншую, — аўтарка актывізуе яго ўнутраную работу. Балазе, тыя праблемы да якіх апелююць творы, знаёмыя бадай кожнаму: гэта вечныя пытанні жыцця і смерці.

Алег Рудзін зрабіў жэст, які наўпрост адсылае да кантэксту. Хто ж не ведае, што маса народу робіць у Палацы фотачкі для сваіх сацсетак. І замест твору, які патэнцыйна цікавы ў якасці фону, ён вывесіў проста таблічку “Не фатаграфаваць”. Зразумела, гэта бы чырвоная ануча для быка. Лепшага закліку да інтэрактыву і не прыдумаеш. Аўтар у сваёй эксплікацыі прапануе дзяліцца досведам фатаграфавання гэтай таблічкі ўжо на віртуальнай платформе. Хочацца верыць, ягоны твор зажыве цікавым жыццём па-за межамі Палаца мастацтва.

...Урэшце, самае важнае, што кантакт, які наладжваецца паміж мастакамі і публікай дзякуючы такім праектам, як “Арт-Мінск”, — гэта цудоўны стымул для росту. І некаторыя з аўтараў сапраўды дэманструюць ад выставы да выставы пэўныя зрухі. Таму будзем спадзявацца, што лепшае яшчэ наперадзе.

Ілья СВІРЫН

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

“Магія” і слова “змагу”

Працяг. Пачатак на ст. 7



Падчас спектакля

Пра падрыхтоўку будучага спектакля калісьці распавядала “К” яго мастацкі кіраўнік — рэктар БДУКіМ, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Наталля Карчэўская (гл. № 19 за 2022 г.). Падзея выклікала вялікі рэзананс, што было зразумела яшчэ да пачатку створанага мюзікла: публіка збіралася вельмі актыўна, да будынка цэнтра, нядаўна адкрытага побач з вучэбным корпусам, спяшаліся суцэльнымі кампаніямі, там і тут мільгалі знаёмыя твары знаных дзеячаў эстрады — і не толькі тых, хто непасрэдна выкладае ў гэтай ВНУ.

Над мюзіклам працавала вялікая каманда прафесіяналаў. Стварыў лібрэта і здзейсніў пастаноўку вядомы рэжысёр Аляксандр Вавілаў. За музычнае начынне адказваў паспяховы прадзюсар і кампазітар Юрый Саваш: пісаў свае песні, перайначваў і рэдагаваў ранейшыя іншых аўтараў (Дзмітрыя Пенкрата, Тарыэла Майсурадзэ, Уладзіміра Сарокіна, што заўчасна пайшоў з жыцця), замаўляў нумары Дзмітрыю Парфёнаву, якому належаць усе інструментальныя кампазіцыі і шэраг песень. Мастаком выступіў Юрый Барысевіч. Каб удзельнікі-пачаткоўцы скарэктавалі свае густы і набылі адпаведны вопыт, быў нават спецыяліст па грыме і прычосках — Іна Цімафеева, якая шмат гадоў працуе са знанымі артыстамі і выкладала ў Школе прыгажосці. Дый на сцэне, акрамя студэнтаў розных спецыяльнасцей (тая ж Вікторыя Маркевіч у ролі сваёй цёзкі — увогуле будучы менеджар) і нават 9-класніцы Лізаветы Немудракінай у ролі дзяўчынкі-барыста, удзельнічалі яшчэ і выкладчыкі — на роўных, што стымулявала абодва бакі. Як цудоўна, што ў Год гістарычнай памяці былі згаданы традыцыі школьнага тэатра, якія развіваліся ў нас з часоў Рэнесансу: у тых вучэбных пастаноўках, што дэманстраваліся на публіку, таксама былі задзейнічаны навучэнцы і іх настаўнікі.

Разгорт сюжэтнай лініі шмат у чым успрымаецца своеасаблівым адказам нашаму Музычнаму тэатру з яго нядаўняй прэм'ерай рэвю “Нарадж'энне зорак”, замоўленага расійскім аўтарам: і там і тут — кастынг-конкурс, прымадонна, стварэнне шоу, дзве заканаваныя пары. Толькі ў БДУКіМ, як ні дзіўна, твор аказаўся на парадак лепшым — без збору ўсіх магчымых і немагчымых штампаў. Бо спектакль — пра сам БДУКіМ! Пра яго апантаных студэнтаў, якія мараць ажыццявіць свае мастацкія ідэі, пра магчымасці, што адкрываюцца перад творчай моладдзю, калі яна ўпэўнена крочыць да сваёй мэты, пра сяброўства і супрацоўніцтва прадстаўнікоў розных кран — пра магію музыкі і кахання.

Пры вялікай колькасці здзейсных асоб, што заўжды было ўласціва школьнаму тэатру, кожны герой — запамінальны, яркі тыпаж, якога не зблытаеш. Бо артысты ўвасабляюць не толькі сваіх персанажаў, але і крыху сябе саміх. Ідэя кастынгу дае магчымасць зрабіць унутры спектакля невялічкую канцэртную праграму — разнастайную, рознастылёвую, разнажанравую. Згадаць маленькія фрагменты “Чаркі на пасашок” Аляксандра Балотніка на словы Аляксандра Лягчылава, расійскага “Юнацтва” братоў Засідкевічаў. Многія кампазіцыі, і не толькі ў рамках кастынгу, глядзяцца як завершаныя нумары з харэаграфіяй, тэатралізацыяй (ажно да выкарыстання марыянетак) і відэакантэнтам, прычым апошні часам уяўляе сабой кліп на песню. Упрыгожвае спектакль і ўдзел аркестра на чале з дырыжорам Анатолем Кудзіным. Жывыя інструментальныя гучанні часам спалучаюцца з сінтэтычнымі, аркестранты звяртаюцца да прыёмаў інструментальнага тэатра, што пачынаюцца са сцэнічнага размяшчэння музыкантаў: струнныя і духавыя — паабапал подыуму, што выходзіць у залу, ударныя — у дзвюх спецыяльных вежах. Пачатак уверцюры нагадвае батл ударнікаў, дзе астатнія аркестранты — у якасці заўзятараў, што падтрымліваюць сваіх улюбёнцаў рухамі, узнятымі смычкамі, нават спевамі і прытанцоўваннем седзячы. Быццам каментарыем да гэтага становіцца выхад працоўнага сцэны са словамі Бялінскага: “Ці любіце вы тэатр”, — і толькі пасля гэтага адкрываецца завеса. Праўда, такое імкненне да як мага большай тэатральнасці часам прыводзіць да надта пафаснай манеры, тэатральнага “крыку”, якія пачынаюць зашкальваць, бо памнажаюцца на ўласціваe мюзіклу выкарыстанне гарнітуры для падгучкі.

“Магія” не першы крок БДУКіМ у абраным кірунку на шляху ад “я мару” да “мы зможам”. Некалькі гадоў таму сіламі студэнтаў быў здзейснены мюзікл “Дуброўскі” расійскага кампазітара Кіма Брэйтбурга, прадэманстраваны на камерцыйнай аснове на розных прэстыжных айчынных пляцоўках і тройчы — з аншлагам у Маскве. Цяперашнюю “Магію” таксама чакаюць далейшыя паказы для шырокай публікі. І не толькі ў Мінску: на чэрвень запланавана паездка ў Бабруйск. Падрыхтаваны некалькі складаў, у спектакль будуць улівацца будучыя першакурснікі — разам з якасцю праробленага, усё гэта стане гарантыяй паспяховага далейшага лёсу прэм'еры.

Спектакль завяршаецца не толькі сустрэчай закаханых, але і запрашэннем шоу ў Кітай. Хацелася б пажадаць, каб сюжэт аказаўся прарочым. А чаму б і не? У спектаклі ўдзельнічаюць Ван Мяйсян (Су Лі), Вань Цзый (Вэй Дун), частка дыялогаў і музычных нумароў гучаць па-кітайску, дый гісторыя — у тым ліку пра навучанне ў БДУКіМ кітайскіх студэнтаў, каханне кітаянкі і беларуса. Засталося хіба спонсараў ці бізнес-партнёраў знайсці — зноў-такі, акурат як у мюзіклі.

І яшчэ. Цяперашняя ўдалая рэалізацыя гэтага, на афіцыйнай мове, студэнцкага “практыка-арыентаванага” праекта вымушае задумацца пра магчымасць такога ж больш ці менш рэгулярнага пракату найлепшых пастановак іншых творчых ВНУ. Тая ж Акадэмія музыкі штогод рыхтуе па некалькі оперных спектакляў, канцэптуальнасць і выкананне якіх можа спаборнічаць з прафесійнымі калектывамі. Але дэманструюцца тыя “маленькія шэдэўры” толькі аднойчы, бо — няма дзе.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Добрая традыцыя ад перасоўнікаў

Многім памятны лозунг "Мастацтва належыць народу", які за савецкім часам быў абавязковым атрыбутам аздобы культурніцкіх устаноў. А былі яшчэ легендарныя мастакі-перасоўнікі, якія гэтую ж ідэю прасоўвалі ў масы яшчэ за часам царскім. Яны першымі ўсвядомілі неабходнасць распаўсюду ў рэгіёнах мастацтва сталічнага ўзроўню. Іх перасоўныя выставы сталі эпахальнай з'явай як у выяўленчым мастацтве, так і ў культурніцкім менеджменце. Ідэі перасоўнікаў актуальныя для нас і сёння. Рэспубліканскія выставы пасля Мінска гастралююць па краіне.

Фрагмент экспазіцыі

Вось і выстава "Канцэпт 21" у сярэдзіне красавіка атабарылася ў Гомелі і будзе працаваць там да сярэдзіны мая. Увазе гомельскай аўдыторыі прапанаваныя выбраныя творы I Трыенале канцэптуальнага мастацтва. Выбраныя — таму што ўсю вялікую выставу, што праходзіла ў сталічным Палацы мастацтва, прывезці ў сталіцу Палесся было папросту нерэальна, зыходзячы з адносна невялікай прасторы Выставачнай залы Карціннай галерэі Г.Х. Вашчанкі.

Арганізацыя экспазіцыйнай прасторы — найважнейшы чыннік любой выставы. У гэтым сэнсе мастацкая імпрэза ў невялікай галерэі можа быць не менш удалай, чым, скажам, у згаданым вышэй Палацы мастацтва. Менавіта так і атрымалася ў Гомелі. Дзякуючы добра прадуманым візуальным і сэнсавым акцэнтам атрымалася захаваць утульнасць і адначасова надаць амаль манументальную маштабнасць. Памятныя мне па Мінску творы высветліліся новымі, у пэўным сэнсе — нечаканымі гранямі. Гэта адчуў не толькі я, але і іншыя мінчукі, што прыехалі на вернісаж. Ды і гомельскія мастакі, што бачылі выставу ў сталіцы, маюць тую ж думку.

Калі гаворка ідзе пра канцэптуальнае мастацтва, дык фармальная прыналежнасць мастака да таго ці іншага творчага цэха нейкай асаблівай ролі не адыгрывае. Твор можа быць рэалістычным ці абстрактным, выкананым на палатне ці на паперы, адпавядаць звыклым крытэрыям скульптуры ці быць так званым аб'ектам, мець прэтэнзіі на філасафічнасць ці ўяўляць сабою рэфлексіўны адбітак эмоцыі. Прасцей кажучы, тут сама ідэя, думка важнейшыя форму іх выяўлення. Хаця, канешне ж, дасведчаны прафесіянал часцей за ўсё будзе мець перавагу над дылетантам-пачаткоўцам і хутчэй дагрукаецца да аўдыторыі. Праўда, у гісторыі мастацтва бывала рознае...

Асаблівасць экспазіцыі ў тым, што ў ёй сабраныя творы, так бы мовіць, ад розных творчых цэхаў. Нешта паводле фармальных прыкмет стасуецца з жывапісам, нешта з дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, нешта адпавядае інсталяцыі, нешта нагадвае скульптуру. Але, паўтаруся, тут галоўнае не форма, а змест і асацыятыўны патэнцыял твора.

Важна адзначыць, што ў экспазіцыі прадстаўлены і ўзоры творчасці мастакоў Гомельскай абласной арганізацыі БСМ. Так што адносна паліткарэктнасці ўсё як мае быць.

Пры сённяшніх інфармацыйных тэхналогіях можна атрымаць даволі поўнае ўяўленне пра тую ці іншую культурніцкую імпрэзу, не ўстаючы з канапы. Быў бы толькі ў руках смартфон. Але ўсё ж такі непасрэдная кантакту з творам гэта замяніць не можа. Думаю, на тэатральныя спектаклі і на мастацкія выставы людзі будуць хадзіць заўжды. Дзеля той асаблівай энергетыкі, што выпраменьваюць сцэна і выставачная залы. У дзень вернісажу па гомельскіх мерках у галерэі быў аншлаг. Як на тэатральнай прэм'еры.

Добрую традыцыю запачаткавалі калісьці перасоўнікі.

P.S. Цяпер гэтая выстава экспануецца ў Брэсце.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

30: ужо, ажно ці толькі?

"Нам толькі 30!" — так назваў Новы драматычны тэатр сваю юбілейную вечарыну, жанрава азначаную як "спектакль-візітоўка".

Сцэна са спектакля "Хамсін"

Візітоўка? Бо другая частка праграмы складалася з фрагментаў ледзь не ўсіх спектакляў цяперашняга рэпертуару ("Вадэвілі", "Дом Бернарды Альбы", "Варшаўская мелодыя", "Жанна", "Чалавечы голас", "Фабрычная дзяўчынка", "Як важна быць сур'ёзным", "Іншапланяцёнак", "Лялька. Фікус. Крама", "Хамсін") і некаторых спісаных у архіў ("Я рэч..." паводле "Беспасажніцы" А.Астроўскага, "Як я стаў..." Я.Пуліновіч). Некаторыя нумары ішлі ў арыгінале, іншыя — толькі намёкам на элементы сцэнаграфіі ці з крыху перайначаным тэкстам, каб упісацца ў агульную канву віншаванняў і прызнання ў любові (сур'ёзнай і жартоўнай) — найперш да тэатра і гледачоў. Назвы большасці спектакляў узнікалі на экране, таму лепшай рэкламы ім прыдумаць было цяжка: нават калі глядзеў іх калісьці, пасля той ці іншай мізансцэны (да таго ж часта з новым акцёрскім складам) узнікала натуральнае жаданне паглядзець тыя пастаноўкі яшчэ.

Афіцыйная частка не пачынала, а, наадварот, завяршала вечарыну. І сама прысутнасць у зале прадстаўнікоў Міністэрства культуры Беларусі і Мангарыбанкама цягам усяго спектакля-канцэрта, а не толькі некалькіх першых хвілін, сведчыла пра іх шчырую зацікаўленасць творчасцю калектыву. Былі зачытаны віншаванні згаданых дзяржаўных устаноў, уручаны ўзнагароды — мастацкаму кіраўніку тэатра Сяргею Кулікоўскаму, артыстам Надзеі Анцыповіч і Арцёму Пінчуку, які ўдала рэалізуе сваю невычэрпную фантазію таксама ў рэжысуры.

А пачаткам сустрэчы стала згадка багатых на падзеі гістарычных старонак. Бо насамрэч тэатр можа святкаваць і 30-ці — і адначасова 35-ціголддзе. Бо ў 1992-м ён набыў статус дзяржаўнага, пачаўшы адлік "новай эры", а ўзнік як самастойная тэатральная адзінка яшчэ ў 1987-м, на хвалі актыўнага студыйнага руху часоў перабудовы і набыцця краінай Незалежнасці. Адпаведнай была і пачатковая назва калектыву — тэатр "Дзе-Я", бо самымі актуальнымі пытаннямі канца стагоддзя і тысячагоддзя былі нацыянальная самаідэнтыфікацыя і далейшы шлях кожнага беларуса. "Хто я?", "Дзе я?", "Куды мы ідзем?" — такія тэмы ўзнімаліся ў тагачасных спектаклях, ажыццёўленых пераважна паводле айчынных крыніц. Якое шчасце, што захаваліся відэазапісы! Нават па тых чорна-белых урыўках было відавочна, колькі новых прыёмаў утрымлівалі "Роспач" паводле знакамітай "Ладдзі..." У.Караткевіча, спектаклі "Рагнеда", алегарычная "Імжа", летась адноўленая ў інтэрнэт-версіі. Тыя папраўдзе інтэлектуальныя пастаноўкі, нягледзячы на сціплы каштарыс, не страцілі сваёй прыцягальнасці.

Сутыкненне гісторыі з будучыняй бачылася і ў тым, што вядучымі вечарыны выступілі дзве пары артыстаў: уладальніца медаля Францыска Скарыны Людміла Баталава, старэйшы "Дзе-Яч" Валерый Агаян — і амаль равеснікі тэатра, надзвычай запатрабаваныя ў сучасным рэпертуары Надзея Анцыповіч і Арцём Пінчук. А з экрана глядзелі коліснія "бацькі"-заснавальнікі тэатра: Мікола Трухан, што пайшоў з жыцця ў 1999-м, і Віталь Баркоўскі, на сёння галоўны рэжысёр Смаленскага драмтэатра.

Юбілей мінае — тэатр застаецца. Напамінам пра святочную дзею будзе выстава на другім паверсе фае, адкрытая да юбілейнай даты. Мастачка тэатра Лідзія Малашэнка не ўпершыню ладзіць падобныя экспазіцыі, у тым ліку асабістыя. Зусім нядаўна ў сталічным Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры праходзіла цудоўная выстава яе эскізаў сцэнаграфіі і касцюмаў да спектакляў розных тэатраў. Штосьці ўвайшло ў цяперашні збор — тыя ж маскі, якія гледачы так і наравілі прымерыць. А вось пры падрыхтоўцы архіўных стэндаў маладая мастачка сутыкнулася з недахопам "гістарычных рарытэтаў": фота давялося шукаць па прыватных калекцыях артыстаў, узніклі цяжкасці з подпісамі, быццам пытанні "хто я, дзе я" набылі новае прыкладное значэнне. Сярод старых афіш увагу прыцягнуў вельмі стыльны плакат "Дзень". Гэты спектакль прайшоў толькі аднойчы, прычым у якасці перадпаказу (гл. "К" № 13 за 2020 г.). Далей карты зблытала пандэмія, частка артыстаў сышла. У такіх умовах было прасцей паставіць штосьці новае, чым аднавіць эксперыментальную пастаноўку, што нават не паспела атрымаць відэазапісу. Парадокс? Хутчэй, напамін пра тое, што кожны пражыты дзень становіцца гісторыяй не праз якое-небудзь "...-годдзе", а ўжо ўвечары. І клапаціцца пра захаванне мастацкіх з'яў трэба штодня.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

АЎТОГРАФ З БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

Пётр Алейнікаў
1914 — 1965 гг.

Савецкі кінаакцёр, адзін з самых папулярных артыстаў СССР 1930–1940-х. Найбольш вядомы сваімі лірыка-камедыйнымі ролямі.

- Фільмаграфія акцёра налічвае 42 работы. Пётр Алейнікаў не меў высокіх узнагарод, але меў вялікую народную любоў і прызнанне сярод гледачоў нават за межамі СССР.
- Пятру Алейнікаву былі ўсталяваныя помнікі ў Галівудзе (1939) і Шклове (2015).
- Аб творчасці Пятра Алейнікава зняты фільм "Пётр Мартынавіч і гады вялікага жыцця" (1974).
- У 1998 годзе на радзіме кінаакцёра ў доме, дзе ён нарадзіўся і вырас, быў адкрыты Дом-музей Пятра Алейнікава. Музей у дакладнасці паўтарае вясковую хату, у якой жыла сям'я Алейнікавых. У ім захоўваюцца ўнікальныя фотаздымкі акцёра, яго малюнкі і інш.

1914
Нарадзіўся 12 ліпеня ў вёсцы Крывель Горацкага павету Магілёўскай губерні (цяпер Шклоўскі раён) у бедной шматдзетнай сялянскай сям'і

Марыць стаць акцёрам. Імкнучыся трапіць у сталіцу, "каб паступіць на артыста", уцякае з інтэрнату, аказваецца ў Барсукоўскай дзіцячай працоўнай калоніі. Там робіцца актывістам мясцовага драмгуртка, спрабуе сябе ў якасці акцёра

1920
У пачатку 20-х губляе бацькоў, збягае з дому, пачынае жабраваць. Трапляе ў Шклоўскую школу-інтэрнат, дзе часцяком наведваецца да мясцовага кінамеханіка, ўлюбляецца ў кінамастацтва

У канцы 1920-х быў пераведзены ў Магілёўскую дзіцячую камуну, пры якой стварае ўласны драматычны гурток

1930 — 1935
Маючы на руках рэкамендацыйны ліст ад кіраўніцтва камуны, паспяхова паступае ў Інстытут сцэнічных мастацтваў. Вучыцца на факультэце ў Сяргея Герасімава, атрымлівае свае першыя ролі ў кіно

Сяргей Герасімаў — рэжысёр, акцёр, педагог, сцэнарыст, стваральнік фільмаў "Маладая гвардыя", "Ціхі Дон"

Алейнікаў у ролі маладзяньгага кухара Пецькі Малібогі, "Сямёра смелых"

1936
З фільмам "Сямёра смелых" да акцёра прыходзяць першы сапраўдны поспех і народная любоў

1939
На савецкія экраны выходзяць музычны мастацкі фільм "Трактарысты" і карціна "Вялікае жыццё", якія набываюць вялікую папулярнасць

1940 — 1950
Алейнікаў здымаецца амаль у 20-ці фільмах, сярод якіх шмат на ваенную тэматыку. Марай акцёра становіцца адыход ад камедыйнага амплуа

1955 — 1965
На сваім творчым шляху Алейнікаў стаў закладнікам створанага на экране камедыйнага вобразу. Драматычныя ролі яму амаль не прапануюць, а ў хуткім часе ўвогуле перастаюць запрашаць на здымкі. Кар'ера прыходзіць у заняпад

1937
Бярэцца шлюбам з Валянцінай Лебедзевай

Пётр Алейнікаў з сынам Тарасам і Валянцінай Лебедзевай

У шлюбе з'яўляюцца двое дзетак, якія ў будучым таксама звязваюць сваё жыццё з кіно

Тарас Алейнікаў (нар. 1938 г.)

Арына Алейнікава (нар. 1943 г.)

Барыс Андрэеў (1915—1982) савецкі акцёр тэатра і кіно. Народны артыст СССР

Пётр Алейнікаў у ролі Сеўні, "Трактарысты"

Падчас здымак Алейнікаў здабыў вернага сябра ў особе калегі Барыса Андрэева. Гэтае сяброўства акцёры пранеслі праз усё жыццё

Роля Іванушкі ў кінаказцы "Канёк-Гарбунок" (1941) таксама стала адной з самых запамінальных

Ролю А.С. Пушкіна ў гісторыка-біяграфічным фільме "Глінка" (1946) Алейнікаў у сваёй кар'еры лічыў найлепшай, але гледачы, новы вобраз акцёра не прынялі

Акцёр цяжка перажывае незапатрабаванасць у кіно, пачынае злоўжываць алкаголем, у яго моцна пагаршаецца стан здароўя

Ролю старога рабочага Маруціна ў фільме "Спаталенне смагі" акцёр сыграў ужо безнадзейна хворым і да прэм'еры не дажыў

Пахаваны на Новадзявочых могілках у Маскве

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

Удзельнікі тэатралізацыі ў Карэлічах

Энцыклапедыя кемлівасці

Мастак напісаў карціну. Падаецца, неблагую, бо і з фарбамі ўсё добра, і з кампазіцыяй. Але вопытны калекцыянер твор не купіў. Конь на карціне запрэжаны няправільна. І знаўцам жывапісу аказаўся той калекцыянер, і знаўцам вясковага жыцця. Ухвальна. Праўду на хлусню пажадана не мяняць. А я падумаў: каб не хлусіць у прафесіі, няблага было б мець энцыклапедыю рамёстваў.

Сапраўды, майстры — гэта не толькі ткачыхі, саломаплялельшчыкі ды ганчары з разьбярамі. У матчынай вёсцы для мяне, малога, доўга быў незразумелым сэнс загадкавага збудавання, якое называлася “хамутарня”. Там панаваў конюх, які адказваў не толькі за прыгожых жывёлін, але і за іхні “такелаж” — аброцькі, лейцы, цуглі... Аказваецца, у спалучэнні з санямі і коламі ўсё гэта называецца “вупраж”.

МАРА ПРА КАНЯ

Дык вось, я хачу ведаць, як называецца (называўся?) кожны матузок і жалезка гэтай вупражы. Знаўцы, калі вы ёсць, намалюйце, калі ласка, і стрэлкамі пакажыце. А раптам коней на Беларусі стане зноў багата, і я не змагу патлумачыць унукам, як сядлаюць жарэбчыка. Хтосьці пасмяецца: у гугле ж, маўляў, усё ёсць. А мне не да смеху, бо хачу тэрміналогіяй валодаць *беларускай*.

Ганцавіцкія метадысты задумалі калісьці стварыць у вёсцы з колішнім конегадоўчым ухілам музей каня — працаўніка, спартсмена, ваяра... Ідэя — супер! Але... Дазволю аўтацытату: добрае не бывае танным. Таму на каня грошай не засталося. Ідэя сталася толькі марай.

Несуцяшальная выснова: работнік культуры павінен валодаць мастацтвам прабіваць сцены непаразумення і знаходзіць грошы немаведама дзе.

ПЕЧКУ НАТАПІЦЬ БЫ

Мо я дажыву да таго шчаслівага часу, калі ў раённых дамах рамёстваў будуць вучыць навыкам печніка. Хто выйграе? Мы! Камін, грубка, печка — абавязковае цёплае ўпрыгожанне катэджа і лецішча.

"Нагародавічы. Радзіма Вікенція Дмахоўскага", 2021. Палатно, алей

Мастак Іван Козел

"Цёплы вечар ля палаца ў Дзятлаве", 2012. Палатно, алей

А печнікоў — абшукайся. Рамяство — з дэфіцытных. Калі мая печка занядужала, мне спатрэбіўся такі спецыяліст. Ягоны візіт нагадваў візіт важнага генерала да занядбанага шарагоўца. Ад яго пахла (зусім не печкай), але ён глядзеў у будучыню з зайздросным спакоем: “Я ведаю, па якой цагліне трэба варсануць, каб твая печка ўвобмірг абвалілася”. На гэтым мы і развіталіся з генералам ад пячнога ацяплення.

ХАЧУ ЎСЁ ВЕДАЦЬ

У згаданай энцыклапедыі патрэбная і схема печкі з пазнакай усіх яе структурных элементаў ды з пералікам усіх рагачоў ды чапельнікаў. А што мы ведаем пра беларускія назвы частак стога ці скірды? Пра назвы рыштунку млынара, рыбака, каваля, пасечніка? Вось каб краязнаўцы сельскіх клубаў і бібліятэк узяліся за гэтую справу! Бестсэлер атрымаўся б. А ёсць яшчэ рамёствы шаўцоў, краўцоў, цесляў. Якія віды аканіц бываюць і як называюцца? А лодкі чым адрозніваюцца?

СПЕВЫ ПАД ПІЛУ

Работнікі культуры **Докшыцкага** раёна расказвалі пра мужчынскі музычны гурт, дзе вядучымі музычнымі інструментамі былі двуручная піла і, здаецца, звычайная каса. Не забыцца б у новай энцыклапедыі і на гэты “сельгасінвентар”. Гурт той распаўся з прычыны таго, што вядучыя музыкі адышлі ў нябыт, а замены ім так і не знайшлося. Практыку згубілі, не згубіць бы тэорыю... А ў старым будынку Чашніцкага РДР я бачыў запісаную тэхналогію рэзкі шкла пад вадой. Нічога падобнага больш не сустракаў.

Рамяство і прафесія — збольшага сінонімы. Цягам часу другое слова замяніла першае. Шэраг прафесій перасталі быць дробнай кустарнай вытворчасцю, пераўтварыліся ў структуру планавага гаспадарання.

На мой капыл, любое рамяство — мастацтва кемлівасці, сялянскай гармоніі і ашчаднага стаўлення да традыцый. А цяпер — наша сталая традыцыя агляду рэдакцыйнай пошты.

ФОРУМ

16—22 мая ў **Магілёве** праходзіць VII Міжнародны форум “Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства”. У чарговы раз Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы стварае міжнародную пляцоўку па абмене вопытам работы па захаванні і актуалізацыі традыцыйнай культуры. Цягам мерапрыемства прэзентавалася свята “Народная талака майстроў”, адбыліся тэатралізацыя “Ручнік як шлях жыцця”, элементы абрадавых дзей, дзейнічалі этнаграфічная экспазіцыя і майстар-класы. Падведзены вынікі конкурсу абласных творчых праектаў па падтрымцы майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Магілёўшчыны. Але асноўнай структурай форуму стала, як і раней, навукова-практычная канферэнцыя “Традыцыйная культура і фальклорная спадчына ў сучаснай культурнай прасторы”.

РОДНАЯ ПЕСНЯ

Пра маладзёжны патрыятычны праект піша старшыня цыклавой камісіі “Тэатральныя дысцыпліны” **Магілёўскага** дзяржаўнага каледжа мастацтваў Алена Ярашук. *“Вынікам праекта стаў літаратурна-пластычны спектакль “Песня роднай зямлі” паводле твораў паэта Алеся Казекі. Пісьменнік стаў кіраўніком праекта і аўтарам тэксту. А ролі ў спектаклі выканала творчая група навучэнцаў каледжа, удзельнікаў тэатра-студыі “Адлюстраванне”. У аснову твора Алеся Казекі леглі ўспаміны маці пра трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. За Год гістарычнай памяці навучэнцы каледжа мастацтваў аб’едуць са спектаклем усе раёны Магілёўшчыны”.*

120 КАРЦІН І 120 ВЕРШАЎ

У адным з **Гродзенскіх** выдавецтваў пабачыў свет альбом мастака Івана Козела, кожная з работ якога падпісана вершамі **Алены Абрамчык**. Яна, старшы навуковы супрацоўнік **Дзятлаўскага** краязнаўчага музея, сама напісала пра гэта. Спадарыня Алена — аўтар зборнікаў вершаў, кніг публіцыстыкі. Іван Козел — прафесійны мастак, выкладчык гімназіі-каледжа імя Івана Ахрэмчыка. Нарадзіўся на Дзятлаўшчыне. Алена Абрамчык піша: *“Гэта ўжо чацвёрты праект, які раней удалося ажыццявіць разам з мастакамі Анатолем Кардашом і Жаннай Лукашэняй з Дзятлаўшчыны, Валянцінай Ранцэвіч з Мінска. Жывапіс Івана Козела называюць архітэктурна-пейзажным. Гармонія жыве на яго палотнах. Іван Мікалаевіч нібыта музыку піша, гістарычную араторыю, у якой і слава роднай зямлі, і боль за яе, і гонар”.* Вельмі добра сказана. А вершы — як працяг мастацкага палатна.

ПАЭТ, СЯМ’Я, ЗАМАК...

У гарадской дзіцячай бібліятэцы **Ваўкавыска** чытачы сустрэліся з паэткай-зямлячкай Марынай Бабіч. Вучні, што прыйшлі на сустрэчу, добра ведаюць творцу не толькі па вершах, але яшчэ і таму, што Марына Віктараўна — кіраўнік інтэлектуальнага клуба “Ваўкавыскія ваўкі” цэнтра творчасці дзяцей і падлеткаў. Напісала пра гэта загадчык дзіцячай бібліятэкі Таццяна Халецкая. А свой зборнік вершаў Генадзь Нічыпар прэзентаваў чытачам **Зэльвенскай** раённай бібліятэкі. Прэзентаваў віртуальна, бо сам знаходзіўся далёка ад Зэльвы. Аднак ці перашкода гэта для аматараў паэзіі? Паведаміла пра падзею намеснік дырэктара бібліятэкі Вольга Камякевіч.

Работнікі культуры **Ашмянскага** раёна зладзілі вандроўку дзяцей у Паўночную вежу **Гальшанскага** замка. Супрацоўнікі Ашмянскага краязнаўчага музея імя Францішка Багушэвіча правялі для наведвальнікаў экскурсію.



Ашмянскія дзеці ў Гальшанскім замку

Метадыст сектара па рабоце з дзецьмі **Бабруйскага** палаца мастацтва Вікторыя Рубец паведаміла, як ва ўстанове адзначылі Міжнародны дзень сям’і: *“12 мая наш сектар наладзіў канцэртную праграму “Сям’я — чароўны сімвал жыцця” для выхаванцаў цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі”.*

НЕЗВЫЧАЙНЫ ПЕРФОРМАНС

“Незвычайны тэатральны перформанс “Памяці не здраджваюць” адбыўся на цэнтральнай плошчы **Карэлічаў**, — паведаміла метадыст аддзела метадычнай работы Карэліцкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Аксана Басюк. — *Трагічны лёс жанчын падчас Вялікай Айчыннай вайны, генацыд яўрэйскага народа, гераізм салдат-вызваліцеляў — гэтыя тэмы сталі ў перформансе ключавымі”.*

Беражыце сябе, шаноўныя! Пішыце пра цікавае.

Сустрэнемся праз тыдзень.

Яўген РАГІН

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

Дзяўчаткі, пастарайцеся вярнуцца!

Адукацыйны праект Бярозаўскага музея

Праект называецца "Ведаць і памятаць гэтыя імёны". Гаворка пра вызваліцеляў Бярозаўшчыны, якія дэманстравалі падчас Вялікай Айчыннай вайны цуды гераізму. А нагодай для даследчай дзейнасці стаў падарунак ад жыхаркі Брэста Наталлі Ілятавай, якая летась наведала наш музей.

На прыступках райвыканкама. Дуванава ў першым радзе (другая справа)

Аляксандра Дуванава і Зоя Балабай. 1999

Ніна Міхайленка, Шура Дуванава і Марыя Варанцова. 1945

Аляксандра Дуванава сярод былых аднапалчан (другая справа)

А падарунак вось які: асабістыя рэчы маці Наталлі Васільеўны, у мінулым — франтавой медсястры Аляксандры Дуванавай, гвардыі яфрэйтара асобнага медыка-санітарнага батальёна 48-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Гэта кніга ўспамінаў, калектыўны пасляваенны здымак, жаночы гадзіннік з гравіроўкай “Бяроза. 55-годдзе вызвалення раёна. 1999 год”.

ФОТА З НАШАГА АРХІВА

Мы, у сваю чаргу, знайшлі фота, на якім франтавікі гвардзейцы, перавязаныя імяннымі стужкамі “Удзельнік вызвалення Бярозаўшчыны”, стаяць з мясцовымі ветэранамі на прыступках райвыканкама. Сярод іншых — і Аляксандра Сцяпанаўна. Побач — яе аднапалчанін-зямляк, варонежац, былы камандзір мінамётнага ўзвода, старшыня Савета ветэранаў 48-й дывізіі Павел Арчакоў.

А вось яшчэ адзін музейны здымак. Аляксандра Сцяпанаўна разам з франтавой медсястрой Зояй Балабай. Сяброўкі крочаць у 1999 годзе па тэрыторыі Чырвоных казармаў.

ЯНЫ НАВУЧЫЛІСЯ БЫЦЬ МУЖНЫМІ

Цяжка было схаваць хваляванне, калі ў масіве дакументнага матэрыялу адшукалася добрай якасці фатаграфія, датаваная чэрвенем 1945-га. Тры дзяўчыны ў гімнасцёрках з “зялёнымі крыламі пагонаў”. У цэнтры — Шура Дуванава. Злева — Ніна Міхайленка, справа — Марыя Варанцова.

Ці варта шмат казаць пра тое, як гэтыя дзяўчаты, санінструктары, медсёстры, ваенфельчары, санітаркі сталі салдатамі, выцягвалі параненых з передавой, штохвілінна рызыкавалі жыццём. Натуральна, баяліся, але мелі мужнасць пабароць гэтае пачуццё.

ПОДЗВІГ ГАЛОЎХІРУРГА

Пры вызваленні Беларусі перадавыя групы медыка-санітарнага батальёна звычайна знаходзіліся ў вайсковых частках, а другія эшалоны з хворымі і параненымі адставалі на 30-40 кіламетраў. І бывалі выпадкі, калі на іх нападалі бадзяжныя групы фашыстаў, што трапілі ў акружэнне. Тады галоўны хірург батальёна Васіль Артамошын браў на сябе камандаванне, і з санітаркамі і лёгкапараненымі байцамі яны ўступалі ў бой да прыходу падмацавання.

У мемуарах так апісваецца выпадак, што адбыўся ў Бярозе: “Спераду ішла машына з Артамошыным. Ён спяшаўся, бо цудоўна ведаў, як важна падрыхтаваць медыцынскую службу да пачатку баявых дзей. І раптам — выбух. Міна! Васіль Пракоф’евіч, цяжка паранены ў ногі, сам сабе робіць аперацыю. Потым 30 гадзін запар аперыруе байцоў, якія адмовіліся ад эвакуацыі ў тыл. За мужнасць Артамошын узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга”.

У ІХ НАРАДЗІЛІСЯ ДАЧКА І СЫН

48-я гвардзейская стралковая дывізія, сфармаваная ў суровым 1941-м з курсантаў Разанскага, Уладзімірскага, Іванаўскага і іншых пяхотных вучылішчаў, граміла ненавіснага ворага ў Падмаскоўі, потым прайшла па ўкраінскіх стэпах, у 1944 годзе ў складзе войск трэцяга Беларускага фронту вызваляла нашу Бярозаўшчыну. А шлях свой пераможны завяршыла ў Празе, куды была перакінута з Берліна.

Гвардыі яфрэйтар Аляксандра Дуванава ўзнагароджана медалямі “За баявыя заслугі”, “За адвагу”, “За ўзяцце Кенігсберга”, “За ўзяцце Берліна”, “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.”. Яна перамагла і здолела вярнуцца.

Але гэта яшчэ далёка не ўсё. Шура Дуванава ўзяла шлюб з камандзірам медсанбата Васілём Ілятавым. У іх нарадзіліся дачка і сын.

ВАЙНА, БЯДА І ЮНАЦТВА

Гэта потым ужо паэт-франтавік Давід Самойлаў напіша пра пакаленне “саракавых, ракавых, свінцовых, парахавых”: “Як гэта было! Як супала — вайна, бяда, мара і юнацтва!” Гэта яны, такія розныя, маладыя мужчыны і жанчыны ў гімнасцёрках і шынялях мералі сяброўства акопнай меркай, узялі на сябе велізарную адказнасць за лёс краіны і годна вытрымалі выпрабаванні на цэльнасць характару, паказалі ўзоры мужнасці і гераізму.

Наша гераіня Аляксандра Дуванава з 1958 года пражывала ў Брэсце і 30 гадоў працавала ў абласной стаматалагічнай паліклініцы медрэгістратарам. Дваццаць гадоў мінула, як яе няма з намі...

Здавалася б, простыя рэчы — фотаздымак, кніга, гадзіннік — вельмі яскрава нагадалі пра іх, вызваліцеляў. І прымусілі зноў задумацца, якой цаной далася гэтым мужным людзям Перамога.

Ала ДРАГАН,
супрацоўнік Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

Да свацці ў Лелікава

З лелікаўскай свацціяй жадаюць сфатаграфавацца ўсе

Некалькі гадоў таму падчас камандзіроўкі ў Кобрынскі раён мне давялося пазнаёміцца з майстрамі, якія зберагалі, захоўвалі і перадавалі маладым пакаленням старадаўнія традыцыі гэтага кутка Брэсцкай вобласці. Бадай, найбольш вядомая — адноўленая традыцыя вырабу і выкарыстання старадаўняга вясельнага касцюма вёсак Лелікава і Павіцке Кобрынскага раёна.

ФАРТУХ З "ВАЧЫМА"

Касцюм гэты незвычайны. Перакананца ў тым можна ў Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. Суворава, які, нягледзячы на свой ваенна-гістарычны профіль, імкнецца прыцягнуць увагу наведвальнікаў і да нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны раёна ды займаецца збіраннем экспанатаў па этнаграфіі. Тым больш названы старадаўні касцюм — гэта, можна сказаць, своеасаблівая візітоўка ўсяго Кобрынскага раёна.

Як расказалі мне ў музеі, цікава ў касцюме лелікаўскай свацці ўсё: доўтая баваўняная сарочка, паркалёвая спадніца, паверх якой завязаны фартух, упрыгожаны аплікацыяй з рознакаляровых стужак і ланцужкоў з закругленымі ромбамі чырвонага колеру — "вачамі", у сярэдзіне якіх на белым фоне — зоркі, вышытыя чорнымі ніткамі. На галаве лелікаўская свацця насіла на асаблівы капыл закручаны плат — доўгі абрэзак ільняной тканіны, какошнік ці "брыжы" з пучком рознакаляровага пер'я, зазвычай узятага ад пеўня. Менавіта так апраналася адна з галоўных дзейсных асоб вясковага вяселля — лелікаўская свацця.

Наконт "вачэй" на яе касцюме ўсё зразумела: не сакрэт, што любая свацця павінна заўсёды добра сачыць за ўсім, што адбываецца падчас вяселля, і пачынаць розныя абрадавыя дзеянні з гасцямі нават сваім позіркам, паставай і рухамі. Ды і прыглядацца да ўсіх магчымых нюансаў святочнай дзеі лелікаўскай свацці таксама не зашкодзіць.

Амаль тое самае тлумачэнне мае і сімвалізм галаўнога ўбору свацці, які быў у выглядзе какошніка ды ўпрыгожваўся рознакаляровымі пучкамі пеўневых пёраў. Гэта яшчэ раз падкрэслівала своеасаблівы "баявы" настрой свацці, сваячкі жаніха-пеўня, ды яе настрой на кіраўніцтва вяселлем, на тое, што яна павінна сачыць за ўсім, як певень сочыць за сваімі курамі, калі яны корпаюцца ў жвіры на падворку. Хоць, канешне, ёсць у гэтым пер'і на галаве і жартаўлівы элемент, які звяртаў увагу гасцей вяселля на пэўную камічнасць гэтага персанажу традыцыйнага вясельнай дзеі.

Касцюм лелікаўскай свацці ў экспазіцыі Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. Суворава

Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. Суворава

Дарэчы, у тым жа Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. Суворава сёння касцюм лелікаўскай свацці прысутнічае ў экспазіцыі "Народны касцюм — жывая традыцыя". І, як адзначылі ў музеі, на аснове новай выставы падрыхтаваны музейна-педагагічны занятак "Знаёмцеся — свацця!", падчас якой любы ахвотны (пераважна гэта школьнікі) можа пагуляць у народныя нацыянальныя гульні ці паўдзельнічаць у старадаўнім абрадзе.

ШЛЯХ ДА ПРЫЗНАННЯ

Сёння такі яркі і арыгінальны ўбор з Кобрыншчыны з'яўляецца значнай этнаграфічнай каштоўнасцю. А да сярэдзіны мінулага стагоддзя захоўвалася жывая традыцыя вырабу ўбору свацці спецыяльна да вяселля. Потым гэты камплект адзення зберагаўся амаль у кожнай сям'і, асабліва там, дзе былі маладыя дзяўчаты.

Яшчэ ў 2018 годзе элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны "Традыцыі вырабу і выкарыстання ўбору лелікаўскай свацці" ў вёсках Лелікава і Павіцке Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці" быў унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Разам з тым, для таго каб раскруціць і адрадзіць гэтую старадаўнюю традыцыю, мясцовымі супрацоўнікамі сферы культуры было прыкладзена шмат намаганняў.

Як растлумачыла мне былая дырэктарка мясцовага метадычнага цэнтра, а потым загадчыца аўтаклуба Кобрынскай раённай клубнай сістэмы Вольга П'янцава, шлях да аднаўлення страчанай з цягам часу каштоўнасці і прызнання традыцый вырабу і выкарыстання ўбору лелікаўскай свацці гісторыка-культурнай спадчынай быў досыць доўгім.

— Мы цягам дзясятка гадоў ладзілі этнаграфічныя экспедыцыі, рабілі фота- і відэаматэрыялы, запісвалі расповеды мясцовых жыхароў, — адзначыла Вольга П'янцава. — Але наша праца засталася б няскончанай, калі б не зацікаўленасць мясцовай супольнасці ў захаванні і папулярызацыі гэтага элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны, у перадачы яго моладзі. Таму дзякуючы неабыякавану стаўленню жыхароў вёсак Павіцке і Лелікава да свайго духоўнага багацця, такім як Настасся Шапяцюк, Ганна Жук, Марыя Шапяцюк, Аляксандра Базылюк ды іншым, нам удалося ўзнавіць гэты цікавы ды арыгінальны вясельны касцюм.

На мой погляд, праца мясцовых культработнікаў па адраджэнні і захаванні сваёй нематэрыяльнай спадчыны заслугоўвае асаблівай увагі. Тым больш гэты прыклад ушанавання сваёй мінуўшчыны не адзінкавы.

Так, некалькі гадоў таму Кобрын атрымаў грант Еўрасаюза прыкладна на 35 тысяч еўра. На гэтыя грошы ў райцэнтры была пабудавана веладарожка даўжынёй у сем з паловай кіламетраў, набыты веласіпеды, якія можна браць напракат, усталяваны дарожныя знакі і зроблены велапаркоўкі. Дзякуючы новаму веламаршруту турысты могуць, нават не сыходзячы са сваіх "жалезных коней", завітаць у гарадскі парк, пабачыць помнік заснавальнікам мястэчка князю Уладзіміру Васільковічу і княгіні Вользе, ужо згаданы музей, Спаскі манастыр XV стагоддзя ды іншыя гістарычныя і культурныя славутасці горада.

Дарэчы, на тэрыторыі згаданага Кобрынскага парку сёння працуюць не толькі атракцыёны, а і летняя дыскатэчная пляцоўка ды амфітэатр, месціцца дзіцячы забаўляльны цэнтр "Кеша" ды іншыя сацыяльныя аб'екты. А яшчэ ў парку ладзяць вяселлі ў старадаўнім стылі, усаджваючы маладых у сапраўдную карэту. Так што і ўбор лелікаўскай свацці, які сёння зрабіўся сапраўдным брэндам Кобрыншчыны, і іншыя матэрыяльныя і нематэрыяльныя цікавосткі гэтага кутка Палесся працуюць на яго імідж і, акрамя ўсяго іншага, прыносяць фінансавы прыбытак установам культуры ды спрыяюць развіццю турыстычнага патэнцыялу ўсяго раёна. Чым не прыклад для пераймання ў іншых раёнах Беларусі?

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ
Фота аўтара

Пётр і Настасся Шапяцюк з Лелікава і Вольга П'янцава (у цэнтры)

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

Выстава "Ганчарны посуд Беларусі" адкрылася ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту.

99 экспанатаў з шасці гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў нашай краіны размясціліся на вітрынах у Спаса-Праабражэнскай царкве-помніку з вёскі Барань. Гэтая выстава — плён працы ўсіх аддзелаў музея. Навуковыя супрацоўнікі адабралі для яе лепшыя ўзоры ганчарнага рамяства, знойдзеныя ў экспедыцыях і рупліва адноўленыя рэстаўратарамі.

Як патлумачыў загадчык навукова-фондавага аддзела Аляксей Абрамчук, керамічныя вырабы на нашых землях пачалі ствараць яшчэ ў эпоху неаліту. А ў X ст. з'явіліся першыя ганчарныя колы. Гліна — пластычны, вогнетрывалы матэрыял, які сустракаецца ў Беларусі паўсюль і адносна лёгка здабываецца. Таму аж да сярэдзіны XX ст. у сялянскіх хатах бытавала пераважна глінянае начынне, зробленае ганчарамі. Шкляны ж і металічны посуд быў дарагэйшым і распаўсюджаным больш у гарадах.

Якія віды керамічнага посуду спарадзіла гаспадарчая вынаходлівасць нашых продкаў? Найперш, канешне, гаршкі розных памераў. Да гаршка падобны макацёр, але ягонае вусце шырэйшае. Гэта быў шматфункцыянальны прадмет: у ім не толькі расціралі мак ці яечныя жаўткі, але маглі таксама ставіць цеста або гатаваць стравы ў печы. У збан налівалі малако ці іншыя вадкасці. Яго лёгка пазнаць па ручцы і носіку для зліву. Гладыш формай падобны да збана, але не мае ні ручкі, ні носіка. Гляк адрозніваецца вузкай гарлавінай, якую закрывалі коркам, таму ў ім зручна было пераносіць ваду, квас, спіртныя напоі. Цыліндрычныя або яйкападобныя слоікі служылі для захоўвання варэння, саленняў, мёду. Увогуле ж існавала так багата разнавіднасцей глінянага посуду з мясцовымі назвамі, што дакладна разабрацца ў іх здольны толькі спецыяліст.

Найстарэйшы экспанат на выставе — вялізны гаршчок для захавання зерня з вёскі Гарадная Столінская раёна. Ён датаваны сярэдзінай XIX ст. Вельмі цікавая авальная пасудзіна з Панямоння — доўгая латушка. На ёй маглі запячы цэлую качку ці малочнае парася. А ўвогуле ўнікальная рэч — вялікая маслабойка ў форме гладыша з драўлянай накрыўкай і берасцяной аплёткай, прывезеная з Усходняга Палесся. Дарэчы, большасць экспанатаў з гэтага рэгіёна паступіла ў музейны фонд у выніку выратавальных экспедыцый пачатку 1990-х па вёсках, адселеных пасля аварыі на ЧАЭС.

Алеся Козіч праводзіць майстар-клас па ганчарстве

Збан распісны, на коле вытачаны...

Аляксей Абрамчук падкрэсліў, што ў кожным рэгіёне ганчары валодалі адметнымі тэхналогіямі, мелі свае сакрэты вытворчасці. Па характэрных знешніх прыкметах керамікі можна вызначыць месца яе паходжання. Так, у згаданай ужо вёсцы Гарадная выраблялі белагліняны посуд, а ў Пружанах — чорнаглянцаваны. Прадукцыя гэтых ганчарных цэнтраў славілася далёка за межамі Заходняга Палесся. Ёсць звесткі, што пружанская кераміка ў 1930-я гг. праз перакупшчыкаў трапляла нават у Англію і Амерыку. Посуд з Гарадной ведалі ў Вільні і на Вальні, у Кіеве і Варшаве. Класічныя дасканалыя формы гараднянскіх вырабаў нагадваюць узоры антычнага мастацтва.

Для Панямоння і Паазер'я было характэрна архаічнае сельскае ганчарства. Тутэйшыя майстры фармавалі посуд метадамі выціскання і налепу, дамешваючы жарству для большай вогнетрываласці. Карысталіся ціхаходнымі ганчарнымі коламі з нерухомай воссю. (Тры колы архаічнай канструкцыі можна ўбачыць у экспазіцыі.) У выніку атрымліваліся масіўныя, важкія вырабы — падобныя да тых, што знаходзяць на раскопках археолагі.

Два найбольш высокаразвітыя ганчарныя цэнтры знаходзіліся ў Івянцы і Ракаве. З канца XIX ст. іх кераміка стала ў асноўным паліванай. Паліва — шклопадобнае пакрыццё на аснове вокісу свінцу, дзякуючы якому посуд робіцца няпорыстым. Тады ў ім добра захоўваюцца вадкасці, яго лёгка мыць. Паліве надавалі пэўны колер, дадаючы ў яе вокіс медзі ці жалеза, марганец. Акрамя таго, вырабы ўпрыгожвалі ангобным роспісам. (Ангоб — гліна, разведзеная вадой да гушчыні вяршкоў.) Івянецкія майстры часта маляваілі хваёвыя лапкі карычневага колеру. На выставе паказаны, напрыклад, збан з Івянца 1940-х гг., распісаны хвалістым узорам з дапамогай рога каровы, у якім спецыяльна прарабілі дзірачку.

Калекцыя керамікі з Ракава пазначана "фірмовым знакам" мясцовых ганчароў — выявай галінкі з лісточкамі і кветценню. Падчас экспедыцыі 2017 г. этнографам пашчасціла знайсці ў Астравецкім раёне вельмі рэдкі ракаўскі збан-дайнік, ідэнтыфікаваны якраз па адметным раслінным роспісе.

Старадаўнія народныя традыцыі даследуюць і працягваюць сучасныя рамеснікі. Падчас адкрыцця выставы гасцям прадэманстравала ўмельства ганчара Алеся Козіч, прадстаўніца мінскага "Клуба майстроў". З камяка высакаякаснай мірскай гліны яна спрытна "выцягнула" на быстраходным ганчарным коле вельмі ладны збан. Алеся патлумачыла, што гэтая тэхніка завецца тачэннем, бо нагадвае працу на такарным станку.

Музеем падрыхтаваны і выдадзены каталог выставы з каляровымі фатаграфіямі і звесткамі пра кожны экспанат. Выстава працягнецца да сярэдзіны восені.

Святлана ІШЧАНКА
Фота аўтара

Цёрлічка (смятаннік), аплецены бяростай ("берасцень"), 1930-я гг.



Аляксей Абрамчук распавядае пра экспанаты

Гляк 1930-х гг. з вёскі Гарадная Столінская раёна



Вырабы з Івянца, 1930–1950-я гг.

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

У Год гістарычнай памяці мне зноў і зноў асабліва хочацца ўспамінаць тых беларускіх мастакоў, якія са зброяй у руках мужна абаранялі нашу Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны і якія пасля Перамогі свае лепшыя карціны, скульптуры, графічныя кампазіцыі прысвяцілі вялікаму Подзвігу нашага вялікага Народа.

В. Грамыка ў партызанскім атрадзе. 1943 г.

В. Грамыка. "Песня пра мой атрад"

В.Грамыка. "Яблькі ўраджаю 1941 года"

"Я слаўлю тых, хто след для нас пакінуў..."

Большасць такіх творцаў — былых франтавікоў і партызан — я добра ведаў, з некаторымі блізка сябраваў, і таму — да іх, людзей з чыстым сумленнем — у мяне трапяткія адносіны. У розныя часы я шмат пісаў пра іх і ў сродках масавай інфармацыі, і ў кнігах — напрыклад, пра Л. Шчамялёва і М.Савіцкага, С.Селіханава і Я.Зайцава, А.Бембеля і А.Глебава, І.Пушкова і М.Зялёнкіна, М.Гуціева і С.Раманава, В.Вярсоцкага і Т.Паражняка, пра іншых пераможцаў Вялікай Айчыннай.

У вядомага паэта-партызана Анатоля Астрэйкі ёсць цудоўны верш пра такіх мастакоў:

Бывае, смутак душу агартае...
Тады ў музей мастацкі я іду,
І смутак мой, нібы туман, знікае —
З жыццёвай праўдай гутарку вяду.
Сустрэчы рады з кожнаю карцінай,
Перад табой нямею, прыгажосць.
Я слаўлю тых, хто след для нас пакінуў
Пра родны край, пра нашу маладосць.

Гэтыя пранізлівыя па душэўнай чысціні паэтычныя радкі цалкам адносяцца і да народнага мастака БССР, былога партызана Віктара Аляксандравіча Грамыкі — кавалера ордэнаў Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалёў "За адвагу" і "Партызану Айчыннай вайны 1 ст.", а таксама ордэна Францыска Скарыны і ордэна Айчыны 3 ст., Залатога медаля ВДНГ і сярэбранага медаля М.Грэкава.

Я добра ведаў Віктара Аляксандравіча, амаль дзесяць гадоў працаваў з ім у апараце Саюза мастакоў БССР, дзе ён двойчы ўзначальваў гэтую творчую арганізацыю, часта сустракаўся з мастаком у яго майстэрні і на кватэры ў нашым "сурганаўскім" доме, разам рыхтавалі матэрыялы да розных мастацкіх пленумаў і з'ездаў. І што б мы ні абмяркоўвалі, якія б мы праблемы ні закраналі, тэма мінулай вайны заўсёды выходзіла ў нашых гутарках на першы план. І гэта зразумела. Вось яго няпоўны паслужны спіс баявой дзейнасці ў час Вялікай Айчыннай: член падпольнай групы антыфашысцкага супраціўлення ў Оршы, разведчык брыгады Канстанціна Заслонава, кулямётчык, камісар 13-га атрада Смаленскага палка асобага прызначэння, адказны сакратар партызанскай газеты "Народны мсцівец".

Так, гэты чалавек быў асобай унікальнай. Шчыры патрыёт зямлі беларускай — без дэманстрацыі напаказ; бліскучы жывапісец і педагог-прафесар, з-пад крыла якога выйшла некалькі пакаленняў творцаў; суразмоўца, з кім можна гаварыць бясконца не толькі ўласна пра "справу жыцця" — выяўленчую культуру, а і пра наогул "філасофію быцця": ад таямніц космасу да сутнасці ваеннай прозы Васіля Быкава, партрэт якога мастак калісьці намаляваў з натуры. А яшчэ ён быў здольным мемуарыстам, сумленным і прынцыповым чалавекам, што датычыцца маральнага стрыжня асобы ды грамадства ў цэлым.

Жывапісец яркай метафарычнасці, складаный алегарычнасці, ён у сваіх найлепшых фігуратыўных карцінах і панарамных пейзажах заўсёды імкнуўся да шматпланавага змястоўнага падтэксту. А падтэкст, дакладней — дэвіз, у яго быў адзіны ў сваім родзе — "убачыць Зямлю ўсю", які можна з поўным правам аднесці цалкам да ўсяго мастацтва Віктара Аляксандравіча. Бо гэтая Зямля з вялікай літары — галоўная і аснаватворная тэма яго мастакоўскага жыцця: зямля, абпаленая агнём вайны і палітая крывёю; зямля, абноўленая пасля Перамогі; зямля і на ёй — чалавек, цудоўны ў сваёй існасці і дабрыні.

Канешне ж, Віктар Грамыка перш за ўсё быў песняром подзвігу чалавека на вайне. І гэты подзвіг ён бліскуча адлюстраваў не толькі ў сімволіка-алегарычных шматфігурных палотнах, але і ў "карцінных" пейзажах-сімфоніях, якія ён вар'іраваў у розных эмацыйных ключах, звязаных з памяццю пра пражытае-адчутае ў мінулай вайне, бо нялёгкае партызанскае юнацтва стрэмкай засела ў ягоным сэрцы. І плынь гадоў гэтае пачуццё не сцірала, а часам нават абвастрала, і тады рука мімаволі цягнулася да пэндзля або да пісьменніцкага пяра (успомнім яго мемуары "Вясёлка над дарогай").

Віктар Грамыка — рэаліст-рамантык, які выпрацаваў гераічны, узвышаны лад мыслення, дзе жыццёвая праўда неаддзельная ад мары, а эпас — ад пранізлівай лірыкі. Партызанская маладосць падарыла мастаку такую магчымасць і сама атрымала ў ягоных творах сваё высокаэстэтычнае вытлумачэнне. Таму работы гэтыя і сёння вельмі сучасныя: ад знакамітых палотнаў "Песня пра мой атрад", "Яблькі ўраджаю 1941 года", "Успамін пра Нарачанскую пераправу", "Разведчыкам майго палка прысвячаю", "Развітанне" да эпічных пейзажных карцін "І неба над намі", "Зямля беларуская", "Дарогі залатой восені"... Сучаснасць гэтая — у іх адкрытасці, у павазе мастака да гледача, у майстэрстве зрабіць яго даверанным сваіх пачуццяў. У гэтым заключаецца вялікае прынцыповае значэнне і каштоўнасць творчасці Майстра.

Успамінаю, як у 1967 годзе Грамыка прадставіў гледачу карціну "Салдаты". Пасля яго дыпломнай работы ў БДТМІ "Дарога мсціўцаў" гэта была другая кампазіцыя пра мінулую вайну. Тры таварышы-ветэраны, быццам жывы помнік, падножжам якому служыць сферычная зямля, стаяць на ўзгорку на фоне велізарнага, ва ўсё палатно, ружаватага неба з белаватымі воблакамі. Двое — з гранёнымі шклянкамі, трэці — з алюміневай конаўкай. І глыбокім маўчанні кожны ўспамінае паўшых аднапалчан на той самай палітай крывёю зямлі, дзе калісьці змагаліся з ворагам. Урачыстая трызна ўчарашніх салдат, чалавечных і чыстых сэрцам. Хвалюючая мізансцэна...

Аднак памятаю, колькі было спрэчак і дыскусій вакол гэтага палатна! Мастака безапеляцыйна абвінавацілі ў "агрубленні рэчаіснасці" і ледзь не ў прапагандзе... алкагалізму. Які, маўляў, прыклад для моладзі? З пазіцыі "прычасанасці", якой надзяляліся многія тагачасныя сусальныя карціны з ваеннымі сюжэтамі, падобныя папрокі былі звыкла зразумелыя. Але штабелі прыкра-парадных пастаралей пра вайну, якіх у тыя часы было вельмі шмат, даўно адышлі ў нябыт, а палатно "Салдаты" і па сённяшні дзень засталося пранізліва глыбокай "насечкай" у выяўленчай культуры Беларусі.

Дык вось, мінулае мастака Грамыкі, яго баявая партызанская маладосць, незагойныя раны вайны не проста ўспаміны "за круглым сталом", гэта сумленнае люстэрка яго думак і перажыванняў. "Крывыя люстэркі" не ў яго характары. Для Грамыкі гісторыя ніколі не была аддзелена ад рэальнага жыцця. Не патэтычная гераізацыя, не подзвіг як асабістая праява, але здольнасць чалавека перад тварам выпрабаванняў раскрыць сваю сапраўдную сутнасць — вось тое, што накіроўвала аўтара да асэсавання вобразаў. А ў іх зліваліся разам і боль, і беды, і мужнасць, і цяжар вайны. Уласная памяць заклікала да таго святога, незабыўнага, што перажыў сам мастак у пачатку вайны, потым у Аршанскім падполлі і ў партызанскіх лясах Віцебшчыны. Праз гады ён увасобіў гэтыя ўспаміны ў карціне, адной з лепшых у яго творчасці, — "1941 год. Над Прыпяццю".

Віктар Грамыка дасягнуў адметных мастацкіх вяршынь і ў сваіх пейзажах, у якіх прыйшоў да своеасаблівай сімфанічнай манументальнасці, не губляючы пры гэтым лірычнай чысціні аголеных чалавечых пачуццяў. У выніку складаецца новы аўтарскі выяўленчы свет, які не толькі строга суаднесены з рэальнасцю, але і надзелены сваімі ўнутранымі вобразна-пластычнымі законамі. Яны ж і дапускаюць шырокае і свабоднае пераасэнсаванне натуры. Невыпадкова такія пейзажна-карцінныя палотны, таксама звязаныя з памяццю пра баявое мінулае аўтара, як "Над старымі акопамі — цішыня", "Ільны беларускія", "Глубелька — сэрца блакітных азёр Беларусі" ці "Чырвоныя землі Полаччыны", назаўсёды ўвайшлі ў залаты фонд беларускага жывапісу.

Так, усё далей ад нас вайна. Нядаўна мы адзначылі 77 гадоў з дня яе заканчэння. Але вось з часам яна як бы пачынае набліжацца да нас, адчуваецца ўсё часцей і ўсё больш пранізліва. Адчуваецца менавіта 22 чэрвеня, калі чорная хмара фашысцкай саранчы навісла над нашай зямлёй, і — у першыя дні мая 1945-га, калі з гэтай саранчой было пакончана.

Канешне, неймаверна балюча, што ў легіёне нашых мастакоў ужо не засталося ў жывых ніводнага ветэрана той вялікай вайны. Але не кожны з іх мае такі помнік, як Віктар Грамыка — пясняр партызанскіх подзвігаў і драм. Дакрануцца да яго жыцця і творчасці позіркам і думкамі можа кожны ў мастацкай галерэі яго імя ў Оршы, у горадзе, які сёлета з'яўляецца Культурнай сталіцай Беларусі.

Барыс КРЭПАК

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 21 / 21 МАЯ 2022 г.

Які лёс чакае камень Адама Міцкевіча?

У маі 2020 года ў беларускіх і замежных СМІ з'явілася сенсацыйная навіна. У старым закінутым склепе ў вёсцы Студзёнкі, што ў Нясвіжскім раёне, мясцовы краязнаўца Аляксандр Абрамовіч адшукаў камень, на якім быў высечаны польскамоўны надпіс "Ева рай страціла, ты яго, пані, уваскрэсіла. Міцкевіч". Знаходка выклікала бурлівыя абмеркаванні ў сеціве і нават сур'ёзныя спрэчкі, бо нехта палічыў, што краязнаўца займаецца містыфікацыяй. Некалькі тыдняў пра далейшы лёс каменнага аўтографа Адама Міцкевіча "думала ўся Беларусь". А потым аб ім проста забыліся. Наша газета пісала пра гэты артэфакт. І сёння прыйшоў час абагульніць вядомае і пайсці далей.

Адам Міцкевіч

ЯК УСЁ ПАЧАЛОСЯ

1 мая 2020 года Аляксандр Абрамовіч апублікаваў у сацыяльных сетках некалькі фатаграфій з месца падзей. Да здымкаў краязнаўца дадаў просьбу дапамагчы расчытаць надпіс на камені. У выніку абмеркавання стала зразумела, што гаворка вядзецца пра сапраўднае адкрыццё, бо звязана знаходка са славутым паэтам, нашым земляком Адамам Міцкевічам. А тое, што гэта не містыфікацыя краязнаўцы, пацвердзілі літаратурныя крыніцы.

Далейшае расследаванне паказала, што камень гэты з'явіўся ў Студзёнках яшчэ ў XIX стагоддзі, аб чым згадвалася ў кнізе "Pologne, Russie, Siberie: Joseph Kalinowski". Была яна прысвечана былому афіцэру, інжынеру, паўстанцу, настаўніку Юзафу Каліноўскаму, які ў 1877 годзе ўступіў у манаскі ордэн кармеліталь і прыняў імя Рафал (у 1991 годзе быў кананізаваны). У кнізе, паміж іншага, сцвярджалася, што ў свой час Адам Міцкевіч пабываў у Студзёнках і пакінуў у альбоме гаспадыні запіс: "Ева рай страціла, ты яго, пані, стварыла". Пазней гэты запіс быў высечаны на камені, які стаяў у садзе, пры дарозе да капліцы. У той жа кнізе сцвярджалася, што візіт у Студзёнкі пакінуў такое моцнае ўражанне ў Міцкевіча, што ён ўвёў яе краявіды як мізансцэну ў сваю паэму "Пан Тадэвуш" (дзеі якой разгортваюцца паміж сённяшнімі Баранавічамі і Навагрудкам). Пазней гэтыя звесткі не раз перадрукоўваліся, але паза межамі нашай краіны. Пэўна, калі б не знаходка каменя, ніхто на тыя ўспаміны не звярнуў бы ўвагі.

ЯКІМ БУДЗЕ ПРАЦЯГ?

Як толькі рэха гістарычных баталій сціхла, нарадзілася пытанне: а што далей рабіць з артэфактам? У маі 2020 года Аляксандр Абрамовіч даслаў на адрас Нясвіжскага райвыканкама ліст, у якім прасіў "**разгледзець пытанне надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці выяўленаму ў вёсцы Студзёнкі каменю з выслоўем паэта Адама Міцкевіча і вясковай сажалкай і дрэвамі, што ўваходзілі ў былы сядзібны комплекс і звязаныя з выдатнымі гістарычнымі дзеячамі**". Неўзабаве прыйшоў адказ, з якога вынікала, што наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі "3" (рэгіянальнага значэння) адносіцца да кампетэнцыі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. Прапанову накіравалі ў Мінскі аблвыканкам для разгляду на абласной радзе па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Пакуль у Мінску вырашалася і вырашаецца пытанне надання статусу, адбыліся перамены ў Студзёнцы. Аляксандр Абрамовіч атрымаў ад гаспадароў аварыйнага склепа дазвол забраць адтуль камень. І ў маі 2021 года адбылася сумесная талака, у якой бралі ўдзел жыхары Студзёнак, валанцёры Арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана і, вядома ж, журналісты газеты "Культура". У выніку талакі камень Міцкевіча вагой некалькі сот кілаграмаў выцягнулі са склепа, і ён "зноў убачыў сонца". Аб чым мы таксама згадалі на старонках "К" (гл. № 18, 2021). Пазней ён быў дастаўлены на падворак спадара Абрамовіча, дзе цярпліва чакае вырашэння свайго лёсу.

На думку сённяшняга апекуна каменя Аляксандра Абрамовіча і жыхароў Студзёнкі, з якімі нам удалося паразмаўляць, найлепшым рашэннем было б зрабіць на беразе сажалкі земляны насып (курганчык), усталяваць камень і паставіць невялічкую альтанку, каб прыкрыць яго ад непагадзі. На вялікі жаль, ад былога студзёнкаўскага хараства толькі і засталося, што сажалка, часткова абсаджаная старымі ясенямі і векавым бэзам. Усё астатняе — сядзіба, парк, сад, капліца-пахавальня і маленькія могілкі вакол яе — даўно пайшло ў нябыт. Таму так важна для мясцовых жыхароў захаваць тое малое, што ацалела.

З ГІСТОРЫІ СТУДЗЁНАК

Пэўна, у чытача ўзніклі пытанні, што гэта за Студзёнкі такія, хто тыя Каліноўскія і якое дачыненне яны маюць да вёскі і знойдзенага каменя. Вядомая гэтая вёсачка з XVI стагоддзя. У 1650-м яе гаспадаром становіцца род Радзівілаў. Напрыканцы XVIII стагоддзя Студзёнкі належалі афіцэру радзівілаўскай міліцыі Ігнату Мараўскаму, які ажаніўся з малодшай сястрой Караля Радзівіла "Пане Каханку" Тэафіляй. Пасля смерці мужа Тэафіля выйшла замуж за Яна Разведаўскага, ротмістра кавалерыі літоўскага войска. Неўзабаве пасля шлюбу, у 1807 годзе, Тэафіля памерла. А праз нейкі час Разведаўскі бярэ другі шлюб — з Марыяй Вангродскай (**менавіта ў гэты перыяд Міцкевіч мог пабываць у Студзёнках, хоць да сённяшняга дня гэты візіт дакументальна не пацвярджаны**). У 1833 годзе іх дачка Сафія выйшла замуж за паручніка Андрэя Грушэцкага, дваранина Магілёўскай губерні. А ў 1857 годзе дачка Андрэя Марыя Грушэцкая пабралася шлюбам з Віктарам Каліноўскім (1833—1880), старэйшым братам згаданага вышэй Рафала.

Андрэй Каліноўскі (1805—1878), бацька Віктара, быў асобай вядомай. Спярша настаўнічаў у віленскай гімназіі. Потым перайшоў на працу ў Віленскі шляхецкі інстытут, вядомы сваімі выхаванцамі (прыкладам, там вучыўся кампазітар Міхал Грушвіцкі, пра якога мы не раз пісалі), а яшчэ пазней стаў дырэктарам гэтага інстытута. Андрэй Каліноўскі быў жанаты тройчы. Апошняй яго жонкай стала Сафія Путкамер, бацькамі якой былі граф Ваўрынец Путкамер і... **Марыля Верашчака** (першае вялікае і напраўду няшчаснае каханне Адама Міцкевіча).

НЯЎДАЛЫЯ ЗАЛЁТЫ ПАЭТА

Бацькамі Марылі былі Антон Верашчака, маршалак шляхты навагрудскага павета, і Францішка Анцута, дачка берасцейскага земскага суддзі (і цётка Ігната Дамейкі).То-бок Марыля была з "яснавяльможных". Таму заваяваць яе сэрца Адам змог, але заключыць шлюб з ёй у "худародната шляхціча" шансаў не было. Нагадаю, што бацька Адама Міцкевіча, які гаспадарыў у Завоссі, не меў ніводнага прыгоннага. Гэтая гісторыя цалкам магла легчы ў канву паэмы Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш", у якой усё пачалося менавіта з няўдалых залётаў "худародната" да "яснавяльможнай".

У Туганавічах і Больценіках, дзе разгортваўся раман Адама і Марылі, былі **свае памятныя камяні**, якія лічыліся месцам спатканняў закаханых. У Больценіках такі камень захаваўся. На ім высечаны крыж, які пакінуў або Адам, або Марыля. Ці захаваўся туганавіцкі камень, невядома, але убачыць, як ён выглядаў, можна на акварэлі Напалеона Орды.

Дарэчы, пра Туганавічы. Не так даўно славутая альтанка са старых раскідзістых ліпавых дрэваў непазнавальна змяніла сваё аблічча. Некалькі з тых дрэваў, якія памяталі пасяджэнні філаматаў і шэпт закаханых маладзёнаў, былі спілаваныя. Таму спяшайцеся ўбачыць тое, што яшчэ засталося.

ЗАМЕСТ КРОПКІ

Як нам некалькі дзён таму паведаміў Аляксандр Абрамовіч, у чэрвені пытанне надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці каменю Міцкевіча можа быць вырашана канчаткова. Значыць, працяг будзе.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Новы выставачны корпус
на вул. К. Маркса, 24.

• Выставачны праект **"Штодзённасці чароўнае імгненне"**, прымеркаваны да 120-годдзя з дня нараджэння Ядвігі Іосіфаўны Раздзялоўскай. **Да 12 чэрвеня**.
• Выстава **"Барыс і Іван Казаковы: постскрыптум"**, прымеркаваная да 85-годдзя Барыса Іванавіча Казакова. **Да 19 чэрвеня**.
• **Выстава шкла** Барысаўскага крыштальнага завода імя Ф.Э. Дзяржынскага. У экспазіцыі — каля 100 твораў з 1950-х да пачатку XXI ст.
Да 19 чэрвеня.

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 397 01 63 (экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• **"Ноч музеяў".**
21 мая з 16:00 да 24:00
• Персанальная выстава беларускага мастака **Дзяніса Барсукова "Ён, Яна, Яны"**. **Да 29 мая**.
• Персанальная выстава **Уладзіміра Савіча**, прымеркаваная да 70-годдзя з дня нараджэння мастака. **Да 29 мая**.
• Выстава беларускіх мастакоў **"Ніколі больш!"**, прысвечаная тэме генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. **Да 5 ліпеня**.
• Выставачны праект **"Залаты век беларускага іканапісу. XVII стагоддзе"**. **Да 26 ліпеня.**

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 358 88 78

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Творчая праграма **"Чароўная ноч у Ваньковічаў"** – у рамках акцыі **"Ноч музеяў". 21 мая з 15:00 да 22:00.** Уваход па білеце ў музей. Тэлефон для даведак: (017) 358 88 78.
• Спектакль тэатра ценяў **"Сядзібны прывід"**. Па папярэднім запісе кожную суботу а 12-й і 16-й гадзінах. Для арганізаваных груп кожную гадзіну штодзённа.
• Квэст-гульня **"Таямніцы старажытнай сядзібы"**.
• Сюжэтна-гульнявая праграма **"Метамарфозы ў сядзібным доме"**. Удзельнікі пазнаёмяцца з традыцыямі маскарадных паказаў XVIII стагоддзя і – з дапамогай інтэрактыву – з экспанатамі музейнай калекцыі.
• Сюжэтна-гульнявая праграма **"Мова веера"**. Удзельнікі пазнаёмяцца з культурай веера розных часоў і народаў, навучацца мове веерных знакаў і мастацтву зносін.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: 507 44 69

• **Пастаянная экспазіцыя**.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл. 8 (0222) 65 07 57, 65 88 00

• **Пастаянная экспазіцыя**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66

• **Пастаянная экспазіцыя**.
• Выстава **"За адвагу, стойкасць і мужнасць"**, прысвечана 80-годдзю заснавання ордэна Айчыннай вайны і прымеркаваная да Дня Перамогі.
Да 31 мая.
• Выставачны праект **"Вызваленне Еўропы" ў рамках Міжнароднага праекта "Тэрыторыя Перамогі"**, які аб'ядноўвае 250 музеяў і ваенна-гістарычных цэнтраў Расіі і замежных краін.
• Віртуальны музейны альбом **"Як нашы дзяды ваявалі".**
• Інтэрактыўная праграма **"Усе вышэй, вышэй і вышэй..." на пляцоўцы ля самалёта Лі-2.** Аб героях вайны і лётных подзвігах, а таксама цікавыя факты з гісторыі ваенна-транспартнага самалёта Лі-2. Кожную суботу і нядзелю з мая па верасень.
• Майстар-класы ў "Музеі для дзяцей" – **пластылінавы жывапіс і малюнак у тэхніцы граттаж** (серада – нядзеля з 10.00 да 17.00).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47.
Тэл.: 242-78-14

• Выставачны праект **"Зачараванні Дэлакруа"**. **Да 29 мая**.

г. Мінск, вул. Некрасава, 3. Тэл.: 399-09-78

• **"Ноч музеяў 2022". Вас чакаюць:** КОТАквэст, artist-talks, медытатыўная практыка, пластычны тэатр, арт-тэрапія, DJ Set. **21 мая. Старт праграмы ў 18:30.**
• Выстава ў рамках IV Міжнароднага фестывалю дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва **"ТэкСтыльны букет"**. **Да 26 чэрвеня**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1.
Тэл.: +375 (17) 2431041 (каса), +375 (17) 361 54 93

• **21 – "Фаўст"** (опера ў 3-х дзеях) Ш. Гуно (12+). Дырыжор – Уладзімір Авадок. Пачатак у 19.00.
• **22 – "Анастасія"** (харэаграфічная легенда ў 2-х дзеях) В. Кузняцова (12+). Дырыжор – Мікалай Калядка. Пачатак у 18.00.
• **22 – Канцэрт Opera & Jazz** (12+). Пачатак у 18.30.
• **25 – Святочны канцэрт да Дня нараджэння тэатра** (12+). Дырыжор – Алег Лясун. Пачатак у 19.00.
• **26 – "Царская нявеста"** (опера ў 2-х дзеях) М. Рымскага-Корсака (12+). Дырыжор – Мікалай Калядка. Пачатак у 19.00.
• **27 – "Стварэнне свету"** (балет у 2-х дзеях) А. Пятрова (12+). Дырыжор – Юрый Караваеў. Пачатак у 19.00.
• **28 – "Дзікае паляванне караля Стаха"** (опера ў 2-х дзеях) У. Солтана (12+). Дырыжор – Уладзімір Авадок. Пачатак у 19.00.

Паважаныя чытачы!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА

на газету "Культура"

Падпісныя індэксы:

• індывідуальная падпіска – 63875,
• ведамасная падпіска – 638752,
• ільготная (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску на адрасы сваіх працаўнікоў і пенсіянераў)* – 63879.

на камплект "Культура" (газета) + "Мастацтва" (часопіс)

Падпісныя індэксы:

• індывідуальная падпіска* – 63874,
• ведамасная падпіска* – 638742.

* Новыя індэксы ўведзеныя з 2 паўгоддзя 2022 г.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, д. 2.
Тэл.: +375 212 66-90-77 (каса)

• **21 – "Церам-церамок"** – (музычная казка на 2 дзеі) С.Я. Маршака (3+). Пачатак у 11.00.
• **22 – "Умка"** (кранальная гісторыя) Ю. Якаўлева (4+). Пачатак у 11.00.
• **26 – "Папялушка, або Крышталёвыя чаравічкі"** (чароўная казка на 2 дзеі) Ш. Пяро (6+). Пачатак у 11.00.
• **26 – "Папялушка, або Крышталёвыя чаравічкі"** (чароўная казка на 2 дзеі) Ш. Пяро (6+). Пачатак у 13.00.
• **28 – "Аладзін"** (казка на 2 дзеі паводле персідскага эпасу **"Тысяча і адна ноч"**) Н. Гернет (6+). Пачатак у 11.00.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: +375177020602, 20660, +375295518051, +375291903149

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці: г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1.
• **Ралі Exotique "Парыж–Нясвіж". 28 мая. Старт ралі 09.00–10.00. Фініш удзельнікаў 13.00–17.00. Далей у праграме вас чакаюць:**
• выстава ў Нясвіжскім замку рэдкіх / экзатычных / унікальных аўтамабіляў і матацыклаў – 13.00–19.00;
• знаёмства з тэхнікай;
• зносіны з удзельнікамі турыстычнага ралі і аўтаблогерамі Беларусі;
• фудкорт;
• фотасесіі;
• узнагароджанне ўдзельнікаў Ралі.

Палацавы ансамбль:
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
• Выставачны праект Максіма Петруля **"deКанструкцыя"**. **Да 3 ліпеня**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
• **"Ноч музеяў"**. Тэма мерапрыемства – 210-годдзе вайны 1812 г., у якой прымаў удзел уладальнік Нясвіжскага замка Дамінік Геранім Радзівіл. **21 мая з 19.00 да 22.00**.
• Выстава-атракцыён па матывах творчасці ветэрана беларускай анімацыі, мастака і рэжысёра Алы Мацюшэўскай **"Час – хуткая рака"** – у рамках мерапрыемстваў па правядзенні Года гістарычнай памяці. **Да 30 чэрвеня**.
• Выставачны праект, прысвечаны Году гістарычнай памяці, **"Пераўтвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны". Да 15 студзеня 2023 г.** У экспазіцыйным зале першага пускавога комплексу.

Ратуша:
Пастаянныя экспазіцыі:
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII – 1-й палове XIX стст."**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стст. **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.
Мерапрыемствы:
• Экскурсія з элементамі гістарычнай гульні **"Музейныя вандроўкі"**.
• Квэст **"Карта сямі каралеўстваў"**.
• **"Дзень нараджэння ў Ратушы"**. Група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў.
• **"Дзень нараджэння з Карамелькай (Лол Пчолкай)"**. Група ад 4 да 10 чалавек ад 4 да 12 гадоў.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён,
Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8-01596) 2 82 90, (8-01596) 2 82 70

• **Пастаянная экспазіцыя**.
• **Міжнародны дзень музеяў "Мір. Май. Музей. Музыка"** – пры ўдзеле лаўрэатаў II Рэспубліканскага адкрытага фестывалю-конкурсу "Музычны Мір". **21 мая. Пачатак канцэртаў а 13 гадзіне**. Уваход па квітках у музей.
• Тэатр **"Шатландская пяхота"** – аповед пра жыццё, культуру і побыт шатландскіх імігрантаў, якія аселі ў Рэчы Паспалітай і знаходзіліся на службе ў тым ліку ў князёў Радзівілаў; дэманстрацыі зброі шатландскіх воінаў часоў Сярэднявечча; фехтаванне; інтэрактыву з гледачамі.
21–22 мая і **28–29 мая**. Унутраны дворык Мірскага замка.
• **Выстава з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея "Веков связующая нить".** На выставе будзе прадстаўлена калекцыя дэкаратыўнай вышыўкі, вязання і пляцення канца XVIII–XIX стст., сабраная першым дырэктарам музея А.Р. Брадоўскім, які быў калекцыянерам і вялікім знаўцам гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Адкрыццё – 27 мая. Месца знаходжання – Слановая зала музея. **Выстава працягнецца да 10 ліпеня.**
• Квэст **"Таямніца двух куфраў"** (**Таямніца князёў Радзівілаў**). **28 мая**. Набыць білеты можна ў касе музея.
• Выстава **"Белая зброя краін свету"**. 1-ы адсек Паўночнага корпуса Мірскага замка. **Да 19 чэрвеня**.
• **Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.**
• **Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых**.
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка"** (група ад 2 да 5 чалавек).
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
• Экскурсія **"Падарожжа ў часе"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце"**; **"Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст."**; **Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст."**; **"Печы з каробкавай кафлі XVI – XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў".**

КУЛЬТУРА

Пераможца 2006 г. Гран-пры 2010 г.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.

Галоўны рэдактар — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч;
Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ;
рэдактар аддзела: Яўген РАГІН;
аглядальнікі рэдакцыі: Надзея БУНЦЭВІЧ, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЕЎ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Змітсер ЮРКЕВІЧ;
мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД.

Сайт: www.kimpress.by.
E-mail: kultura.bel@yandex.by.
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23.
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41.
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, вытворны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
© "Культура", 2022.
Наклад 3048.
Індэксы 63875, 638752.
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 20.05.2022 у 18:00. Замова №1119.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.